Пролетарыі всіх краін, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

10 год выданьня.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Невыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. „ 3 „ — 2 р. 70 к. „ 6 „ — 4 р. — к. „ 1 год — 8 р. — к. Зьмена адрасу іншагародняя — 20 к. мясцовая — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок капітэрай пасьля тэксту — р. 25 к. За радок капітэрай перад тэкстам 1 р. — к. За радок капітэрай перад тэкстам 1 р. 50 к. Скідкі ня 50 проц. дазвол. Вялікі тэрмін барыцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумент 25 к. За кожны дадатковы 15 „ Бесплатныя і чарговаправерка дакумент 15 „ За кожны дадатковы 5 „ Публікацыі ЗАГО'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газеты, на ўсіх аддзяленнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пост.-тел. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газеты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА.

№ 228 (2717) Субота, 5-га кастрычніка 1929 г.

ПРЫВІТАНЬНЕ ЦК КП(б)Б.

Улічваючы вялікае значэньне калектывізацыі сельскае гаспадаркі, мы, рабочыя і работніцы фабрык і заводаў Нова-Барысава, аднагодна адпрацоўваем адзін дзень чацьвёртага кастрычніка ў карысьць арганізацыі трактарнай калёны, якая будзе пачаткам масавай калектывізацыі Барысаўскага раёну.

Няхай жыве і мацнее цесная сувязь рабочае клясы з працоўным сялянствам на шляху да індустрыялізацыі краіны.

Няхай жыве кампартыя Беларусі і яе кіраўнік—Ленінскі ЦК!

Англа-савецкія адносіны.

Падпісаны ўчора тав. Даўгалеўскім і ангельскім міністрам замежных спраў Гендэрсонам пратакол «аб працэдуры ўпарадкаваньня спрэчных пытаньняў» азначае бясспрэчны крок наперад у галіне савецка-брытанскіх адносін. Дасягнутае пратаколам на бліжэйшы час поўнае аднаўленьне дыплёматычных зносін між Англіяй і СССР азначае поўны і выразны крах палітыкі „разрыву", пры дапамозе якой цьвёрдалобыя спадзяюцца паставіць на калені першую ў сьвеце дзяржаву пралетарскай дыктатуры.

Пазіцыя „рабочага" ўраду ў першыя тыдні пасьля прыходу яго да ўлады адбівала, пераважна, імкненьне ўхіліцца ад канфлікту в цьвёрдалобымі. Лібэральная «Манчэстэр Гардыян» в поўнаю падставаю адзначала, што «рабочы» ўрад, як відаць, больш баіцца гневу кансэрватараў, чымся грамадзкай думкі сваёй уласнай партыі. З другога боку, усё больш і больш даваў сябе адчуваць нажым ангельскага пралетарыяту, значная частка якога галасавала на выбарах за лейбарыцкіх кандыдатаў, іменна затым, што ад «рабочага» ўраду яна чакала заснаваньня нармальных зносін з Савецкім Саюзам.

Усё гэта стварала для габінэту Макданальда вельмі складанае становішча і адбілася на напрамку паводзін „рабочага" ўраду, які на працягу доўгага часу ня мог выразна выказаць свайго погляду. Так, напрыклад, перададзеная Народнаму Камісару на Замежных Справах праз нарвэскага даверанага ў справах нота Гендэрсона ад 17-га ліпеня запрашала «дэлегаваць у Лёндан адказнага прадстаўніка з мэтаю абмеркаваць непасрэдна з міністрам замежных спраў працэдуру для самага шпаркага дасягненьня прыяцельскага і здавальняючага для абодвых бакоў вырашэньня спрэчных пытаньняў, уключаючы сюды прапаганду і даўгі». Хоць ніхто не разумеў, навошта патрэбна было загадзя абмяркоўваць працэдуру перамоў, якія павінны распачацца толькі праз некалькі месяцаў, аднак урад СССР пашоў насустрач прапанове Гендэрсона і камандыраваў у Лёндан т. Даўгалеўскага. У часе перамоў давялося, аднак, хутка пераканацца ў даволі асаблівым разуменьні «Форэйн Офісам» тэрміну «працэдуры». Тав. Даўгалеўскі апыніўся перад спробаю падмяніць абмеркаваньне працэдуры на абмеркаваньне шэрагу пытаньняў па сутнасьці.

Зузім бясспрэчна, што тут выявілася імкненьне „рабочага" ўраду ў дагоду кансэрватарам паставіць Савецкаму Саюзу некаторыя папярэднія ўмовы для аднаўленьня зносін. Саюзнаму ўраду не заставалася нічога інакшага, як яшчэ раз паўтарыць, што ён не намеран адступаць ад той пазіцыі, якую ён цьвёрда і нязьменна займае ў пытаньні аднаўленьня савецка-брытанскіх адносін.

Пазіцыя гэтая мае поўную выразнасьць: першаю ўмоваю ўсіх перамоў па спрэчных пытаньнях зьяўляецца поўная раўнапраўнасьць абодвых бакоў, недапушчэньне навязваць аднабаковыя папярэднія ўмовы і аднаўленьне нармальных дыплёматычных зносін. З гэтае прычыны толькі пасьля таго, як будуць поўнасьцю адноўлены груба разарваныя ўрадам Бальдвіна—Чэмбэрлена дыплёматычныя зносіны, Саюзны ўрад будзе лічыць магчымым распачаць перамовы па сутнасьці пытаньняў.

Як вядома, ліпнёўскія перамовы Даўгалеўскага і Гендэрсона павінны былі быць перарванымі і перарыў цягнуўся 2 месяцы. Перамовы аднавіліся згодна запросін Гендэрсона 24-га верасьня, за тыдзень перад адчыненьнем зьезду „рабочай" партыі ў Брайтоне, на якім ураду Макданальда належала даваць справаздачу за сваю дзейнасьць на працягу 4-х месяцаў.

На гэты раз прамовы прывялі да станоўчага выніку. Савецкая формула „спачатку аднаўленьне зносін, а пасьля перамовы па сутнасьці" на гэты раз была прынята і ангельскай дзяржавай. Абедзьве дзяржавы пагадзіліся на тым, што ўпарадкаваньне ўсіх спрэчных пытаньняў будзе адбывацца толькі пасьля аднаўленьня дыплёматычных зносін у поўным абхваце, уключаючы абмен пасламі.

Такою зьяўляецца гісторыя апошніх англа-савецкіх перамоў. За час, які мінуў в моманту разрыву зносін па віне і ініцыятыве ўраду цьвёрдалобых, СССР выявіў вялікі творчы размах у палітычнай, эканамічнай і культурнай галінах, дасягнуўшы бурнага тэмпу гаспадарчага разьвіцьця, значэньне якога ня могуць адхіляць нават нашы ворагі. За гэты час наша чырвоная дыплёматыя в поўнаю быстрыманасьцю і цьвёрдасьцю абараняла міжнародна-палітычныя пазіцыі СССР на аснове прынцыпаў міру.

Мы можам в поўным спакоем чакаць далейшых крокаў ангельскага ўраду ў пытаньні аб упарадкаваньні англа-савецкіх адносін.

„Правда".

Папярэднія вынікі праверкі і чысткі партыі.

ЦК і ЦКК УсеКП(б) прапануюць рашуча змагацца з усімі спробамі зажыму самакрытыкі.

МАСКВА, 4-X. ЦК і ЦКК УсеКП(б) абмеркавалі пытаньне аб папярэдніх выніках праверкі і чысткі партыі. Ва ўхваленай пастанове адзначаецца, што папярэднія падлікі паказваюць станоўчыя вынікі чысткі ў справе ўмацаваньня шэрагаў партыі і згуртаваньня навакол партыі шырокіх пралетарскіх мас.

Поруч з гэтым у пастанове адзначаны недахопы ў ходзе чысткі. Так, у некаторых мясцох чыстка праходзіць без належнага кіраўніцтва з боку парткамітэтаў. Слаба ўцягнуты рабочыя масы ў чыстку савецкіх ячэек, слаба выкрываюцца сапраўды прымазаныя, сапраўды абанкрочаныя элементы. У выніку ў некаторых арганізацыях процант вычышчаных у савецкіх ячэйках ніжэйшы за процант вычышчаных у вытворчых ячэйках. Кантрольныя камісіі ня ўжываюць своячасова захадаў да неадкладнага выпраўленьня гэтых памылак.

Пастанова прапануе ўсім партарганізацыям, парткамітэтам і кантрольным камісіям неадкладна праверыць на канкрэтным матар'яле вынікі чысткі і ўжыць захады да выпраўленьня данушчаных памылак. У паасобку, неабходна, нават у ячэйках ужо праверваных, зьбіраць і разглядаць заявы на тых ці іншых сяброў партыі, адмоўная дзейнасьць якіх ня была заўважана праверачнымі камісіямі.

Пастанова падкрэсьлівае недастатковую ўвязку чысткі партыі ад сацыяльна-варожых элементаў з задачаю адначаснага шырокага ўцягненьня ў шэрагі партыі рабочых і батрацкіх мас. Пастанова падкрэсьлівае, што чыстка партыі павінна быць магутным штуршком да далейшага разгортваньня самакрытыкі і ўскрыцьця хваравітых зьявішчаў у партыйных арганізацыях.

Пастанова прапануе, каб парткамітэты і кантрольныя камісіі ўжылі ўсе захады да забясьпекі шырокага разьвіцьця самакрытыкі, да ўцягненьня шырокіх мас у працу па выпраўленьні і палепшаньні дзейнасьці парторганаў і дзяржаўнага апарату, да рашучага праследваньня ўсіх спроб зажыму самакрытыкі.

Спачуваньне ад ураду СССР.

МАСКВА, 3-X. Учора ўвечары Народны Камісар па Замежных Справах т. Літвінаў паведаў нямецкага паслу пана фон-Дырксэна і выказаў яму ад імя ўраду Саюзу спачуваньне з прычыны сьмерці міністра замежных спраў пана Штрэзэмана. Ім пасланы тэлеграмы з выказам спачуваньня нямецкаму рэйхсканцлеру Мюльлеру і жонцы нябожчыка Штрэзэмана.

* * *

БЭРЛІН, 2-X. Народны Камісар па Замежных Справах т. Чычэрын, які знаходзіўся ў Вісбадэне, прыслаў рэйхсканцлеру тэлеграму з выказам спачуваньня з прычыны сьмерці Штрэзэмана.

АБ СКЛІКАНЬНІ ПЛЕНУМУ БЮДЖЭТНАЙ КАМІСІІ ЦВК БССР.

18-ГА КАСТРЫЧНІКА Г. Г. У ГОР. МЕНСКУ СКЛІКАЕЦЦА ПЛЕНУМ БЮДЖЭТНАЙ КАМІСІІ ЦВК БССР.

ПАРАДАК ДНЮ НАСТУПНЫ:

1. ДЗЯРЖАЎНЫ БЮДЖЭТ БССР НА 1929-30 Г.
2. ВЫКАНАНЬНЕ БЮДЖЭТУ ЗА 1927-28 Г.

САКРАТАР БЮДЖЭТНАЙ КАМІСІІ ЦВК БССР А. БРУШКОЎ.

Крах палітыкі „разрыву".

Савецкі ўрад цьвёрда і нязьменна стаіць на сваіх пазіцыях.

ЗЬМЕСТ АНГЛА-САВЕЦКАГА ПРАТАКОЛУ

аб працэдуры ўпарадкаваньня спрэчных пытаньняў між урадам Савецкага Саюзу і ўрадам Вялікабрытаніі.

Наступныя пытаньні падлягаюць упарадкаваньню шляхам перамоў між абодвымі ўрадамі:

§ 1. Вызначэньне адносін абодвых урадаў ад дагавору 1924 году. 2) Гандлёвы дагавор і зьвязаныя з ім пытаньні. 3) Прэтэнзіі і контрпрэтэнзіі міжурадавыя і прыватныя, даўгі, прэтэнзіі, якія выплываюць з інтэрвэнцыі і інш. і фінансавыя пытаньні, зьвязаныя з гэтымі прэтэнзіямі і контрпрэтэнзіямі. 4) Рыбалоўства. 5) Прыстасаваньне ранейшых дагавораў і канвэнцый.

§ 2. Перамовы між урадам яго вялікасьці злучаным каралеўстве і ўрадам СССР аб упарадкаваньні памянёных вышэй пытаньняў будуць мець месца зараз-жа пасьля аднаўленьня дыплёматычных адносін у поўным абхваце, уключаючы абмен пасламі.

§ 3. Памянёныя вышэй перамовы будуць праводзіцца з боку ўраду СССР савецкім паслом у Лёндане і з боку ўраду яго вялікасьці злучаным каралеўстве статс-сэкратаром яго вялікасьці па замежных справах.

§ 4. Упаўнаважаныя абодвых урадаў, у разе неабходнасьці, будуць карыстацца дапамогаю мошаных камісій, сябры якіх будуць назначацца ў аднолькавай колькасьці кожным урадам з ліку сваіх грамадзян, службовых ці прыватных асоб, спэцыяльна знаёмых з даным пытаньнем.

§ 5. Гэтыя экспэрты паведамяць сваім упаўнаважаным аб выніках супольнага вывучэньня пытаньняў і аб прапановах для вырашэньня іх.

§ 6. Усе згоды, якія выплываюць з перамоў між упаўнаважанымі, набудуць форму дагавору ці дагавору між абодвымі ўрадамі.

§ 7. Зараз-жа пасьля сапраўднага абмену пасламі і не пазьней дню перадачы адпаведнымі пасламі іх вярыцельных грамат, абодвы ўрады ўзаемна падцьвердзяць абавязацельствы наконт прапаганды згодна арт. 16 дагавору, падпісанага 8-га жніўня 1924 году між Вялікабрытаніяй і Паўночнай Ірляндыяй, з аднаго боку, і СССР—з другога.

§ 8. Адначасна з адобраньнем абодвымі ўрадамі працэдуры, згодна §§ 1-7, урад яго вялікасьці злучаным каралеўстве ўхваліць пастанову аб аднаўленьні нармальных дыплёматычных зносін з СССР, уключаючы абмен пасламі.

§ 9. Рашэньне аб даўгох, памянёных у папярэдніх §§, уключаючы рашэньне аб аднаўленьні дыплёматычных адносін, будзе пададзена на ўхвалу парляманту ў самым пачатку бліжэйшай сэсіі. Зараз-жа пасьля абмеркаваньня гэтага пытаньня ў парляманце, кожны з двух урадаў зробіць належныя крокі для назначэньня адпаведных паслоў.

В. Даўгалеўскі.
Артур Гэндэрсон.

Лёндан, 3-га кастрычніка 1929 г.

Тав. Літвінаў аб англа-савецкіх перамовах.

МАСКВА, 4-10. У гутарцы з прадстаўніком ТАСС тав. Літвінаў выказаў сваё здаволеньне тым, што другое падарожжа тав. Даўгалеўскага ў Лёндан, у процілегласьць яго першаму падарожжу, скончылася посьпехам—падпісаньнем пратаколу, зьмест якога поўнасьцю адпавядае пазіцыі Саюзнага ўраду ў даным пытаньні.

Спыніўшыся на гісторыі англа-савецкіх перамоў тав. Літвінаў заявіў: „Устаноўлены сьпіс пытаньняў, якія падлягаюць у далейшым абмеркаваньню, ня мае нічога новага,—бо тыя-ж пытаньні былі тэмаю абмеркаваньня між абодвымі ўрадамі ў 1924 годзе і знайшлі вядомае вырашэньне ў падпісаным тады панам Макданальдам дагаворы, які, аднак, быў пазьней адхілены кансэрватыўным урадам, зьмяніўшым габінэт Макданальда.

Мы палічылі мэтазгодным прапанаваць распачаць абмеркаваньне ўсіх пытаньняў з вынятьнем адносін абодвых урадаў да дагавору 1924 году ў цэлым ці на асобных яго частках і з гэтае прычыны паставілі гэтае пытаньне на першае месца ў сьпісе. Згодна пратаколу пан Гэндэрсон абавязаўся падаць у самым пачатку сэсіі парляманту, якая адчыняецца 29-га кастрычніка, прапанову ангельскага ўраду аб неадкладным аднаўленьні нармальных адносін і аб абмене пасламі.

Мы максымальна ішла насустрач прапановам вялікабрытанскага ўраду, паколькі яны не закранаюць нашай прынцыповай пазіцыі. Пам застаецца цяпер толькі спакойна чакаць далейшых крокаў ангельскага ўраду ў духу яго шматлікіх публічных заяў і ў адпаведнасьці з толькі што падпісаным прадстаўнікамі СССР і Англіі пратаколам".

Тав. Даўгалеўскі аб пасьпяховых выніках перамоў.

ЛЁНДАН, 4-10. Паўнамоцны прадстаўнік СССР у Францыі т. Даўгалеўскі выехаў з Лёндану ў Парыж.

* * *

ЛЁНДАН, 4-10. Тав. Даўгалеўскі ў гутарцы з карэспандэнтам ТАСС заявіў: „Перад выездам з Лёндану я хачу выказаць сваё задаволеньне пасьпяховым вынікам перамоў між Гэндэрсонам і мною. У выніку перамоў, занатаваных у пратаколе аб працэдуры і ўпарадкаваньня спрэчных пытаньняў між абодвымі ўрадамі, працэдура набудзе моц зараз-жа пасьля поўнага аднаўленьня дыплёматычных зносін між абедзьма дзяржавамі, уключаючы абмен пасламі.

Гэтая пастанова была ўхвалена ў духу першага абмену нотамі між абодвымі ўрадамі, у тым духу, у якім савецкі ўрад быў прасякнуты, калі прымаліся запросіны ангельскага ўраду аб пасылцы паўнамоцнага прадстаўніка ў Лёндан.

Я спадзяюся, што згода, дасягнутая між Гэндэрсонам і мною, будзе пачаткам заснаваньня ў бліжэйшай будучыні трывалых адносін між Вялікабрытаніяй і СССР".

Што скажа ангельскі ўрад.

ЛЁНДАН, 3-10. Агэнцтва Рэйтэра паведамляе: „Сёньня прадстаўнік савецкага ўраду тав. Даўгалеўскі падпісаў дакумент, які змацоўвае англа-савецкую згоду наконт аднаўленьня дыплёматычных зносін. Дакумент зьяўляецца згодаю на пытаньні аб прапагандзе і згодаю аб вядзеньні перамоў па ўсіх спрэчных пытаньнях. Гэндэрсон таксама ўжо падпісаў дакумент.

Цяпер дакумент будзе разгледжаны абодвымі ўрадамі, якія вырашаць пытаньне аб тым, ці падлягае дакумент ухвале. Ангельскі габінэт разгледзіць дакумент на бліжэйшым сваім пасяджэньні ў сераду".

У ПОШУКАХ ВЫХАДУ.

Зьбіраецца імпэрскі саюз „нямецкай індустрыі". Гэты сапраўдны гаспадар ураду сацыял-дэмакрата Мюлера будзе заняты на сваім зьезьдзе, галоўным чынам, пошукамі выхаду са становішча, якое ўтварылася з прыняцьцем пляну Юнга. Зьезд бізнэсоўца выпрацуе дырэктывы, выканаць якія сацыял-дэмакратычны ўрад палічыць сваім абавязкам. У гэтым ласьне палітычнае значэньне зьезду.

Як-жа ацэньвае становішча, што ўтварылася ў краіне, «нямецкая індустрыя»? Аб гэтым мы даведваемся з артыкулу, зьмешчанага ў органе нямецкіх прамыслоўцаў напярэдадні зьезду. Газэта цьвёрда ўстанаўляе, што плян Юнга будзе брасьць з Нямеччыны ад 1,7 да 2,5 мільярдаў марак у год. Да гэтай сумы трэба яшчэ дадаць каля 1 мільярду процантных грошай за крэдыты, якія былі неабходны Нямеччыне дзеля таго, каб у працягу апошніх пяці год запаўняць дзюркі, што ўтварыліся пры выкананьні рэпарацыйных плацяжоў па пляну Даўэса. І ў далейшым пакрыцьцё плацяжоў па пляну Юнга і процантаў па пазыках сутыкаецца з вялізарнымі цяжкасьцямі. Як паказаў вопыт, разьлікавы баланс Нямеччыны знаходзіцца ў некаторай раўнавазе толькі ў тым выпадку, калі ёй не даводзіцца плаціць па спэцыяльных абавязацельствах (рэпарацыі, процанты па пазыках для пакрыцьця плацяжоў).

„Дэйчэ Альгемэйне Цэйтунг" знаходзіць толькі два выхады з утворанага становішча: дадатковыя замежныя пазыкі, павялічэньне вывазу і скарачэньне ўвозу.

Разьмеры будучых замежных пазык, водлуг думкі газэт, велічыня з многімі невядомымі, бо цяжка загадзя сказаць што-небудзь у гэтай капрыснай галіне. Что датычыцца павялічэньня вывазу, дык яно магчыма толькі ў строга пэўных межах. Ня гледзячы на ўсе натугі прамысловасьці і ўраду, вываз за апошнія гады ўзрос вельмі нязначна. У 1913 годзе нямецкі вываз дасягнуў у сярэднім 841 мільёну марак у месяц, у 1924 г.—544, у 1925 г.—733, у 1926 г.—818, у 1927—852, у 1928 г.—970 і ў 1929 г.—1.092 мільёны марак. Трэба пры гэтым прыняць пад увагу, што рост вывазу выклікае павялічэньне ўвозу сыравіны і паўфабрыкатаў. Каб вываз дасягнуў патрэбных дзеля выкананьня пляну Юнга разьмераў, трэба, каб у «эканамічнай палітыцы рашаючых дзяржаў заняла больш месца ідэя сусьветнай гаспадаркі і вольнага гандлю».

Але газэта, нажаль, прымушана канстатаваць, што практыка дзяржаў ідэе на іншаму шляху. Ангельцы пе адкідаюць сумненьня ў тым, што яны разглядаюць нямецкія натугі павялічыць вываз, як у вышэйшай меры непажаданую канкурэнцыю. Паўночна-Амэрыканскія Злучаныя Штаты толькі тое і робяць, што яшчэ больш павялічваюць мытавую сьцяну і старанна закрываць у ёй дзюркі, якія яшчэ засталіся. З усіх 29 краін, які два гады таму назад пастанавілі ў Жэневе адмяніць забарону вывазу і ўвозу, толькі 12 згадзіліся ратыфікаваць гэтую пастанову. Італія вядзе шалёную барацьбу супроць усіх замежных тавараў. Лічбу дзяржаў, якія стаяць за вольны гандаль, можна па пальцах пералічыць.

Пасьля газэта пераходзіць да трэцяга шляху—скарачэньня ўвозу. Гэты шлях азначае для Нямеччыны скарачэньне вытворчасьці і росту беспрацоўя. Скарачэньне ўвозу магчыма за лік памяншэньня ўжываньня сыравіны і харчовых прыпасаў. Гэты шлях можа быць небясьпечны ў эканамічных і палітычных адносінах.

„Дэйчэ Альгемэйне Цэйтунг" прыходзіць да выводу, што і пры пляне Юнга, як і ў часы Даўэса, Нямеччына толькі тады будзе ў стане выканаць свае абавязкі, калі яе будуць снабжаць замежным капіталам. Апроч гэтага, нямецкі ўрад павінен растлумачыць чужаземным дзяржавам, што яны абавязаны дапамагаць росту нямецкага вывазу, калі хочуць ухіліцца крушэньня пляну Юнга.

Значыць, клопаты аб новых пазыках і нясупынныя пагрозы крушэньнем пляну Юнга—гэткія дырэктывы «нямецкай індустрыі» свайму ўраду. Але вопыт апошніх гадоў паказаў, што замежны капітал хоча цячы ў Нямеччыну ня ў выглядзе пазык, а ў форме захопу ў свае рукі прамысловых прадпрыемстваў. Інакш кажучы, плян Юнга прывядзе да распродажу нямецкага нацыянальнага багацьця—оптам і ў розьніцу. Што-ж датычыцца пагрозы крушэньня пляну Юнга, дык яна ня страшная замежнаму капіталу, паколькі ён сам будзе гаспадарыць у Нямеччыне.

У пошуках выхаду «нямецкая індустрыя» ня можа знайсьці іншых шляхоў, акрамя тых, якія ляжаць у рамках капіталізму, які ўсё больш пасьляваенны гісторыяй асуджан на хуткую пагібель. Адгэтуль—супярэчнасьці і нікчэмнасьць гэтых шляхоў. **Сапраўдны выхад са становішча, якое ўтварылася, можа даць толькі перамога нямецкага пралетарыяту.**

А. Віль.

ПРЫНЯЦЬ РАШУЧЫЯ МЕРЫ

(Па тэлефону менскай радыё-станцыі).

У Магілеў дастаўлена 2.000 пудоў ільнянога насеньня для заводу «Зара». Насеньне ляжыць пад адкрытым небам на зямлі на чыгуначнай ветцы.

Насеньне выгружана па загаду начальніка станцыі Магілеў. Аб гэтым ведае адміністрацыя, але ня прымае ніякіх захадаў.

Нанкінскае войска адступае.

НАНКІНСКІ ЎРАД ВЫСЛАЎ 30-ТЫСЯЧНУЮ АРМІЮ НА АБАРОНУ КАНТОНУ.

ШАНХАЙ, 3-X. Наконт распаўсюджаньня Нанкінам паведамленьняў аб вялікіх перамога нанкінскага войска над войскам Чан-Фа-Гуя зазначаюць, што ў выніку гэтых „перамог" Чан-Фа-Гуй заснаваў новую дывізію з нанкінскага войска, якое трапіла ў палон ці дабраахвотна перайшло да паўстаўшых.

Нанкін пасылае 30 тысяч войска на поўдзень на абарону Кантону ад гуансійцаў, а таксама ад магчымага наступу Чан-Фа-Гуя. Чан-Кай-Шы аддаў загад атакаваць гуансійцаў зараз-жа, не чакаючы набліжэньня Чан-Фа-Гуя.

Посьпех войск Чан-Фа-Гуя.

ПЭЙПІН, 4-10. Агэнцтва Сімбун Рэнго паведамляе, што галоўныя сілы Чан-Фа-Гуя, якія дасягаюць 25-ці тысяч штыкоў, з посьпехам насоўваюцца да правінцыі Гуансі. У сучасны момант войска Чан-Фа-Гуя дасягнула Баоцыну і Тыгаиню. Агэнцтва Рэйтэра паведамляе, што афіцыйныя весткі нанкінскага ўраду з зазначэньнем, нібыта большасьць войска Чан-Фа-Гуя разьбеглася, не адпавядае сапраўднасьці.

АМЭРЫКАНСКАЯ ПРЭСА АБ ГОЛАДЗЕ Ў КІТАІ.

ПЭЙПІН, 1-X. Як ужо паведамлялася, місія амэрыканскага чырвонага крыжу, якая выяжджала ў галадаючыя мясцовасьці Кітаю, прыйшла да выводу, што голад у Кітаі выклікан, пераважна, ненарадкамі, адсутнасьцю моцнай цэнтральнай улады, бандытызмам і г. д.

Наконт гэтага ангельская газэта „Норт Чайна Стандарт" піша: „Даклад місіі амэрыканскага чырвонага крыжу робіць моцны ўрад кампаніі, якую праводзіць Нанкін в мэтаю дамагчыся адмены існуючых угавораў. Мы раім нанкінскаму ўраду падумаць над прычынамі нежаданьня дзяржаў адмовіцца ад прывілей экстэрытарыяльнасьці. Будзе лепш, калі Нанкін выправіць становішча, якое выклікае нараканьні, замест таго, каб спрабаваць дапамагчы справе прапагандаю і іншымі палітычнымі сродкамі".

Амэрыканская газэта «Норт Чайна Стар" піша: „Амэрыканскі погляд такі, што голадам у Кітаі павінен цікавіцца перш-на-перш кітайскі ўрад. Паколькі цэнтральны кітайскі ўрад амаль што нічога ня робіць, каб палегчыць становішча,—Амэрыка зробіць яшчэ менш».

ПРАЛЕТАРЫЯТ ДАЕ АДПОР

Рашучыя выступленьні пралетарыяту.

ВЕНА. Выступленьне рабочых супроць фашыстаў ня спыняецца. Так, 28 верасьня ў Эбэне (Верхняя Аўстрыя) некалькі сотняў жанок рабочых заводу наладзілі на рынку стыхійную дэманстрацыю супроць фашыста-абшарніка, які прывёз прадаваць свае прадукты. 29 верасьня ў прамысловым цэнтры Вэйцы здарылася сутычка між фашыстамі і сацыял-дэмакратычнай арганізацыяй—шуцбундам. Паранен адзін сябра шуцбунду. 30 верасьня ў Грацы пры сутычцы сур'ёзна паранена 2 сябры шуцбунду і адзін фашыст.

30 верасьня ў Вене адбылося 2 сходы кампартыі, на іх выступаў прадстаўнік нямецкае кампартыі. Усе спробы паліцыі арыштаваць яго ня мелі посьпеху, не зважаючы на тое, што на адным з сходаў прысутнічаў вялікі нарад паліцыі і на сход трэба было праходзіць праз доўгую шэрэнгу паліцэйскіх.

Бойка рабочых з паліцыяй.

НЬЮ-ЁРК, 3-X. У Марыёне (штат Паўночная Караліна) памерла трое бастуючых ад ран, атрыманых у час сутычкі з паліцыяй. Некалькі бастуючых адчувае сябе вельмі дрэнна. Пасьля звальненьня самых актыўных працаўнікоў прафсаюзу раптам забаставалі рабочыя, якія ўваходзяць у згодніцкі аб'яднаны саюз тэкстыльных рабочых. Каля прадпрыемстваў выстаўлены пікеты, якія не прапушчаюць штрэйкбрэхераў.

Здарылася сутычка з паліцыяй. Двое бастуючых забіта на месцы, трэці памёр ад ран у шпіталі. Апроч таго, паранена 12 бастуючых, 2 штрэйкбрэхеры і адзін паліцэйскі. Прафсаюз заяўляе, што бастуючыя ня былі ўзброены і што паліцыя раптоўна распачала страляніну на пікетах. Паліцыя заяўляе, што нібыта бастуючыя першымі распачалі страляніну. У Марыён прыслана войска.

Забастоўка пратэсту.

БЭРЛІН, 2-X. Сярод будаўнічых рабочых в вялікім удзымам прайшла аднагадзінная забастоўка пратэсту супроць зьніжэньня дапамогі беспрацоўным. Водлуг папярэдніх вестак, у забастоўцы ўдзельнічала больш за палову ўсіх будаўнічых рабочых.

Катарга за ўдзел у дэманстрацыі.

РЫГА, 2-X. За ўдзел у мірнай дэманстрацыі беспрацоўных, якая адбылася яшчэ ў студзені месяцу, суд прыгаварыў аднаго з арыштаваных дэманстрантаў на 3 з паловаю гады катаргі і двух — на год кожнага.

У ЛІТВЕ.

Інтэрв'ю Вальдэмараса.

КОЎНЯ, 2-X. Былы прэм'ер даў яшчэ некалькі інтэрв'ю прадстаўнікам друку, у якіх паўтараў асноўныя палажэньні інтэрв'ю, дадзенага прадстаўніку „Летувос Жыньёс". Заявы Вальдэмараса аб сваім адыходзе ад дзяржаўнай дзейнасьці „у імя выратаваньня Літвы", нястрыманыя заўвагі на адрас прэзыдэнта і кіруючага органу партыі таўцінінкаў робяць вялікія ўскладненьні ўнутры краіны. Наогул выступленьні Вальдэмараса сустракаюць адмоўныя адносіны. Апазіцыйныя колы насьмяхаюцца, зазначаючы, што Вальдэмарас «сам апыніўся ў тым становішчы, якое стварыў для іншых".

Афіцыёз „Летувос Айдас" у перадавіцы іранізуе над заявамі Вальдэмараса, зазначаючы на поўную беспадстаўнасьць выказаных ім поглядаў.

Перагляд справы аб пакараньні сьмерцю.

КОЎНЯ, 2-X. Водлуг вестак газэты „Ідышэ Штымэ", вярхоўны трыбунал будзе 12 кастрычніка разглядаць касацыйную скаргу Кучынскага і Кантаўскаса, засужданых да кары сьмерці ў сувязі з выкрыцьцём тайнай друкарні „Спартак". Крастынайтэ, засужданая на гэтай самай справе да катаргі на ўсё жыцьцё, памерла нядаўна ў астрозе.

Арышт сходу.

КОЎНЯ, 1-10. Агэнцтва Эльта паведамляе, што паліцыя выкрыла нелегальны сход у цэнтры гораду. Водлуг чутак, асобы, арыштаваныя на гэтым сходзе, зьяўляюцца прыхільнікамі Вальдэмараса.

ГРАМАДЗЯНСКАЯ ВАЙНА Ў АЎГАНІСТАНЕ

ЛАНДАН, 30-9. Аб становішчы ў Аўганістане, пэшаварскі карэспандэнт „Таймс" піша, што становішча Хабібулы ва ўсходняй правінцыі вельмі ўзмацнілася і ён больш не спатыкае там ніякага сур'ёзнага супраціўленьня. На поўдні Надзір-хан ставіць сабе мэтаю захапіць Вазіры і Лашкар, прычым магчыма, што ён мае намер прасунуцца ў даліну Лёгара. Да захаду ад Кабулы ад жніўня ня было ніякіх сутычак. З прычыны гэтага, Хабібула мае магчымасьць перакінуць войска, якое там стаіць, у іншыя пункты. У паўночнай правінцыі таксама, відаць, спакойна.

Становішча ў Кандагары застаецца ня высьветленым, але мяркуюць, што горад знаходзіцца ў руках войска Хабібулы, хоць ён і асаджаны войскамі племені дурані.

Водлуг паведамленьня агэнцтва Рэйтэр з Сімлы, войска Надзір-хана прасоўваецца ў напрамку да Лёгару.

Пераход на бесперапынны тыдзень зрываецца

ВСНГ БССР і яго ўстановы не падрыхтаваліся да пераводу прадпрыёмстваў на бесперапынны рабочы тыдзень.

БОЛЬШ УВАГІ ГЭТАМУ ВАЖНЕЙШАМУ ГАСПАДАРЧА-ПАЛІТЫЧНАМУ МЕРАПРЫЁМСТВУ

ПАТРЭБЕН РАШУЧЫ ПЕРАЛОМ.

Вялізарнейшыя задачы сацыялістычнай перабудовы ўсяго гаспадарчага арганізму, максымальнага ўздыму вытворчых сіл краіны, узьнікшыя культурнасьці працоўных мас патрабуюць баявых тэмпаў працы ва ўсіх галінах нашай дзейнасьці: гаспадарчай, культурнай, адміністрацыйнай і г. д.

З мэтаю ўзьнікшыя вытворчых сіл краіны, павялічэньня выпуску прадукцыі, больш поўнага скарыстаньня сродкаў вытворчасьці і рабочай сілы, саюзны ўрад выдаў пастанову аб пераходзе на бесперапынны рабочы тыдзень прадпрыемств, гаспадарчых, культурных, адміністрацыйных і іншых устаноў і арганізацый.

Пераход на бесперапынны рабочы тыдзень павінен даць вялізарнейшы эфэкт. Па статыстычных падліках пераход на бесперапынны тыдзень дасьць рост прадукцыі на 20 проц., калі ўвесьці ва ўсёй прамысловасьці і 3-4 проц., калі ўвесьці часткова. Пераход на бесперапынны тыдзень паскорыць працэс індустрыялізацыі, ён значна павялічыць колькасьць рабочых, што паменшыць беспрацоўе.

Мы ў сучасны момант адчуваем таварны голад, пераход на бесперапынны тыдзень дапаможа ліквідаваць гэты голад. Разам з гэтым пераход на бесперапынны рабочы тыдзень у галіне правядзеньня хуткага тэмпу індустрыялізацыі і каапэрацыйных установах дасьць магчымасьць забясьпечыць спажыўча таварамі без чаргі. Такім чынам, гэтэ мерапрыёмства з пункту гледжаньня гаспадарчага эфэкту мае надзвычайна вялікае значэньне.

У сельскай гаспадарцы мы адчуваем вялікі недахват буйных складаных машын, у прыватнасьці трактараў. Тыя трактары, якія ў нас ёсьць, яны не скарыстоўваюцца поўнасьцю, дзякуючы розным рэлігійным сьвятам і наогул немэтазгоднаму разьмеркаваньню працоўнага часу.

Пераход на бесперапынны тыдзень дасьць магчымасьць поўнасьцю скарыстаць с.-гаспадарчыя машыны. Вялікае значэньне мае пераход на бесперапынны рабочы тыдзень у адміністрацыйных і культасьветных установах. Гэтым мерапрыёмствам значна паленшыцца абслугоўваньне працоўных мас з боку гэтых устаноў.

Пераходам на бесперапынны рабочы тыдзень мы зьнішчаем усе рэлігійныя сьвяты, а гэта таксама мае вялізарнейшае значэньне.

Як-жа ў нас выконваецца дырэктыва Саюзнага ўраду па пераводу ўстаноў, прадпрыёмств, каапэрацыйных і іншых арганізацый на бесперапынны рабочы тыдзень? Мы сёньня праверылі ў цэлым шэрагу ўстаноў і арганізацый як абстаіць гэта справа і выявілася, што пытаньнем пераходу на бесперапынны рабочы тыдзень сур'ёзна амаль ніхто не займаўся. Былі агульныя размовы ў паасобных установах па гэтаму пытаньню, але канкрэтных вынікаў амаль нідзе і ніякіх няма. Сёньня мы вымяшчаем матар'ял як з гэтым пытаньнем абстаіць справа ў ВСНГ БССР. Такое становішча мы маем і ў іншых галінах нашага будаўніцтва. Напрыклад, па культасьветных установах пытаньне пераходу на бесперапынны рабочы тыдзень нават не абгаварвалася.

Трэба пакончыць з такімі нядбайнымі адносінамі да вялізарнейшага гаспадарча-палітычнага мерапрыёмства. Трэба зрабіць рашучы пералом. Дырэктывы ўраду павінны быць выкананы.

Я. М.

Нядбайныя адносіны да пераходу на бесперапынны тыдзень.

ЗАМЕСТ ГЛЫБОКАЙ ПРАПРАЦОЎКІ ПЫТАНЬНЯ—ЗЬБІРАЮЦЦА „НА ЧАСОК". АДКАЗНЫ ПРАЦАЎНІК ВСНГБ У ПОШУКАХ ЗА МАТАР'ЯЛАМІ АБ „НЕПРАРЫЎЦЫ". ЗАВОДЫ САМАТУГАМ ПЕРАХОДЗЯЦЬ НА БЕСПЕРАПЫННЫ ТЫДЗЕНЬ. МЭТАД САМАТУЖНІЦТВА Ў ВЫЯЎЛЕНЬНІ ПАТРЭБНАЙ РАБОЧАЙ СІЛЫ.

Рабочыя масы з энтузіязмам сустрэлі пастанову ўраду аб пераводзе працы прамысловасьці на бесперапынны рабочы тыдзень, на сваіх сходах і нарадах рабочыя віталі гэта мерапрыёмства Савецкай улады, якое дасьць магчымасьць больш шпаркім тэмпам пашыраць індустрыялізацыю краіны, больш узмоцненым тэмпам будаваць сацыялізм.

З газэт мы ведаем, што шэраг прадпрыёмстваў ужо перашоў на бесперапынны тыдзень, перашлі і пераходзяць на яго ўстановы і арганізацыі. Калі ня мыляемся, дык на бесперапынны тыдзень перайшоў і апарат ВСНГБ.

Як-жа прапрацоўваецца пытаньне аб пераводзе прамысловасьці на бесперапынны тыдзень у ВСНГБ, як яно прапрацоўваецца ў беларускіх трэстах, мы зьбіраемся гаварыць.

На запытаньне нашага супрацоўніка ў апараце ВСНГБ,—хто можа паінфармаваць аб падрыхтоўцы да пераводу прамысловасьці на бесперапынны тыдзень, яго накіравалі да т. Гольдберга, але апошні адсутнічаў і мы вырашылі найсьці самім па трэстах.

Заглянулі ў Лесбел. Бачым, там знаходзіцца і т. Гольдберг, які прышоў таксама за інфармацыяй аб падрыхтоўцы пытаньня да пераводу на бесперапынны тыдзень, бо атрымана тэлеграма ледзь не т. Куйбышава, трэба тэрмінова даць весткі ў Маскву, але ў ВСНГБ матар'ялаў няма, і адказнаму працаўніку апошняга прышлося за імі бегаць па трэстах.

Што-ж, жывую сувязь толькі трэба вітаць, але... У трэсьце матар'ялы, па заяве кіраўніка апошняга, яшчэ стала не распрацаваны. Мы, кажа т. Гарадзецкі, далі заданьне сваім прадпрыёмствам прапрацаваць пытаньне, калі атрымаем з месц, дык унясем канкрэтывы і апрацуем.

Калі гэта будзе, а мне трэба сёньня,—кажа прадстаўнік ВСНГБ.

Кажаце, сёньня? Калі ласка, можна і сёньня, так, відаць разважаюць у Лесбеле. Сапраўды, у прысутнасьці нашага супрацоўніка т. т. Школьнік і Фэльдман (працаўнікі трэсту,—відаць эканамісты) дагаварыліся сабрацца на „часок", каб апрацаваць лічбы аб дадатковай рабочай сіле, якая будзе патрэбна ў зьвязку з пераходам прадпрыёмстваў Лесбелу на бесперапынны рабочы тыдзень.

Пастаноўка працы як у самім ВСНГ, так і ў Лесбеле проста на „яць". Атрымоўваецца тэлеграма з Масквы, у ВСНГ пачынаецца гарачка і бегатня па трэстах. У трэсьце-ж вырашаюць сабрацца на «часок», каб апрацаваць лічбы патрэбнай рабочай сілы.

Сапраўды, любата, а ня праца...

Павольным тэмпам...

Па кантрольных лічбах Лесбелу на 1929-30 год, апошняму, як асноўнаму лесазагатоўцу патрэбна 3.000.000 кубамэтраў рознага лесаматар'ялу. У чэрвені ці ліпені Эканомнарада адпускае Лесбелу толькі каля 2200 тысяч кубамэтраў. Па пратэсту Лесбела ў канцы жніўня пытаньне гэта яшчэ раз разглядаецца ў Эканомнарадзе, якая даручае Дзяржпляну прапрацаваць пытаньне аб патрэбнай Лесбелу колькасьці лесаматар'ялаў.

У першых днёх верасьня Дзяржплян выказваецца за тое, каб адпусьціць Лесбелу поўнасьцю па яго кантрольных лічбах. Лесбел застаецца пры асобнай думцы, лічучы, што павінна быць узята пад увагу неабходнасьць пераводу заводаў на бесперапынны тыдзень (патрэбна больш сыравіны).

Пытаньне пераносіцца ў СНК, які прыблізна ў палове верасьня выносіць пастанову задаволіць Лесбел поўнасьцю па кантрольных лічбах, а пытаньне аб сыравіне, якая патрэбна для пераводу прадпрыёмстваў на бесперапынны тыдзень, даручаецца прапрацаваць ВСНГБ і прадставіць на разгляд у Эканомнараду.

ВСНГБ, як кажуць, пытаньне гэта прапрацаваў, зразумела пры дапамозе Лесбелу. Урэшце, хто каму дапамагаў ня так ужо важна. Важна тое, як пра працоўвалі, бо прыклад з нарадай „на часок" прымушае з апаской брацца за прагляд гэтых матар'ялаў. Да рэчы, яны ўжо накіраваны ў Эканомнараду і будуць, відаць, хутка разглядацца.

Як бачыце, пытаньне з водпускам сыравіны прасоўваецца досыць павальным тэмпам, відаць, яшчэ больш павальным тэмпам прапрацоўваецца стала пытаньне ў ВСНГ і Лесбеле аб пераводзе прадпрыёмстваў на бесперапынны рабочы тыдзень. А ў гэты час...

Па таму-ж Лесбелу такое буйнае прадпрыёмства, як Бабруйскі камбінат па сваёй уласнай ініцыятыве і нават без узгадненьня з трестам ужо перайшоў на бесперапынны рабочы тыдзень. Таксама саматугам перашлі на бесперапынны тыдзень заводы «Зьвязда" і „Пралетары" ў Мазыршчыне. Пераход і тут не ўзгаднён з Лесбелам.

Між тым пытаньне з забесьпячэньнем сыравінай яшчэ ня вырашана. Нават, калі яно будзе вырашана і ў станоўчы бок, дык усё роўна большасьць заводаў Лесбелу можа быць пушчана на „непрарыўку" толькі ў другой палове бягучага гаспадарчага году, бо пераважная колькасьць сыравіны будзе дастаўлена заводам толькі сплавам—вясной 1930 г.

Нельга ня спыніцца яшчэ на адным вельмі цікавым факце ў галіне падрыхтоўкі нашых цэнтральных устаноў да пераводу прамысловасьці на бесперапынны рабочы тыдзень. Як вядома, гэта мерапрыёмства патрабуе дадатковай рабочай сілы, якую, да рэчы сказаць, трэба яшчэ падрыхтаваць. З мэтай распрацоўкі мерапрыёмстваў па падрыхтоўцы рабочай сілы, Наркампрацы тыдні за два таму назад склікаў нараду, на якой мелася на ўвазе заслухаць даклад ВСНГ Бел. аб пэрспэктывах у галіне патрэбнай рабсілы ў зьвязку з пераходам прамысловасьці на „непрарыўку".

— З Вышэйшага Савету Народнай Гаспадаркі ў Наркампрацы адказалі, што даць дакладчыка па гэтаму пытаньню ня могуць, бо толькі да 25 кастрычніка спадзяюцца самі мець матар'ялы. Так нарада і не адбылася, а Наркампрацы даў указаньне сваім мясцовым органам распачаць на мясцох выяўленьне патрэбнай рабочай сілы і вызначаць мерапрыёмствы для падрыхтоўкі.

Да саматужніцтва ў пераходзе асобных прадпрыёмстваў на бесперапынны рабочы тыдзень дадаецца яшчэ саматужніцтва ў выяўленьні патрэбнай рабочай сілы. І гэтае ў такім важным пытаньні, як перавод прамысловасьці на бесперапынны тыдзень.

Вывады?

Іх зробяць адпаведныя органы, мы-ж патрабуем пакончыць з сьпячкай, з саматужніцтвам і ўсю падрыхтоўчую працу весьці плянавым парадкам,

Вас. Паўночны.

ЗА КЛЯСАВА-ВЫРАЗНЫ І ГІБКІ АПАРАТ

ТОЛЬКІ ШЫРОКАЙ АРГАНІЗАЦЫЯЙ АКТЫЎНАСЬЦІ РАБОЧЫХ, БАТРАЦКА-БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКАЙ МАСЫ САВЕЦКІ АПАРАТ АЖЫЦЬЦЁВІЦЬ СВАЕ ЗАДАЧЫ.

За шырокае абгаварэньне праэкту Палажэньня аб арганізацыі сельсаветаў

„Выкананьне задач, якія стаяць перад Савецкай краінай у галіне правядзеньня хуткага тэмпу індустрыялізацыі і сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі, патрабуе сыстэматычнай перабудовы ўсяго дзяржаўнага кіраўніцтва ў сэнсе прыстасаваньня яго ў адпаведнасьці з сыстэмай нашае гаспадаркі і сацыялістычнага будаўніцтва".

(XVI партканфэрэнцыя УсеКП(б).

Так фармулявала XVI партканфэрэнцыя задачы перабудовы савецкага апарату. Канфэрэнцыя далей падкрэсьлівае, што паленшаньне працы апарату магчыма толькі пры ўдзеле ў яго рацыяналізацыі і штодзённай працы шырокіх колаў працоўных. Адным з важных зьвеньняў нашага апарату зьяўляецца сельсавет. У порыд фарсыраванага наступленьня на капіталістычныя элемэнты гораду і вёскі, калі вясковы кулак, непман узмацніў сваё супрацьіўленьне, калі ён імкнецца пралезьці туды, дзе ў нас яшчэ слабыя месцы, у гэты час сельсавет адыгрывае рашучую ролю ў справе арганізацыі бяднацка-серадняцкай масы вёскі на сацыялістычную ле перабудову. Сельсавет, як частка савецкага апарату, справіцца з пастаўленымі задачамі толькі тады, калі ён будзе складацца ня з двух актыўных працаўнікоў (старшыня і сэкратар), а калі ў ім будзе ўдзельнічаць уся працоўная маса. Адной з форм уцягненьня мас у працу сельсаветаў зьяўляецца ажыўленьне працы яго сэкцый.

Наступная сэсія ЦВК БССР, якая распачаецца 25 кастрычніка, абгаворыць пытаньне паленшаньня працы сельсаветаў і наданьня ім больш самастойных правоў. Сэсія, бязумоўна, аддасьць значную ўвагу працы сэкцый сельсаветаў, бо яны зьяўляюцца асноўнай формай удзелу мас у будаўніцтве, скарыстаньня іх энтузіязму ў справе больш хуткага тэмпу індустрыялізацыі. Матар'ял, які сёньня зьмяшчаецца аб працы сельсаветаў, сыгналізуе небясьпеку, паведамляе аб наступленьні клясавага ворага, аб скрыўленьні клясавай лініі некаторымі сельскімі саветамі. Гэта значна ўскладняе працу Сесіі па абгаварэньні і вырашэньні гэтага пытаньня. Сэсія належна справіцца з гэтай задачай, калі будзе ажыцьцёўлена ўстаноўка XVI партканфэрэнцыі, калі паленшаньне працы апарату будзе праведзена з удзелам шырокіх мас. Гэта ўскладае задачу на сельсаветы РВК і АВК хутчэй абгаварыць з удзелам працоўных мас праэкт аб сельсаветах. Зьмешчаны ў нашай газэце праэкт „Асноўных палажэньняў арганізацыі сельсаветаў" (гл. №№ 218 і 219) павінен быць шырока абмяркован і прапрацован працоўным сялянствам. У гэтай кампаніі вельмі важную ролю адыгрывае і друк. Друк можа сканцэнтраваць і арганізаваць грамадзкую думку вакол гэтага пытаньня, але толькі тады, калі армія рабселькораў сваім удзелам будзе гэтаму дапамагаць.

Шырокае абгаварэньне праэкту «Палажэньня аб сельскіх саветах» рабочымі, бядняцка-серадняцкімі масамі, высьвятленьне ў друку—гэта рашучыя моманты ў справе ўзьняцьця працы сельсаветаў, у справе выпрамленьня іх лініі і зробіць іх поўнасьцю клясава выразнымі.

Г. С.

Праваўхілісты са слуцкага камгасу.

(Ад нашага бабруйскага карэспандэнта).

Па сьлядох Бабруйскага гарадзкога камгасу на зрастаньне з прыватнікам пашоў і Слуцкі гарадзкі камгас.

Каб даказаць, што гэта так, даволі прывесьці гісторыю з дагаворамі камгасу на сады. Тут-то была прыватніку поўная воля. Сады здаваліся без усялякае платы толькі за загарожу і догляд або за невялікую плату. На самай справе ніякае агарожы садоў не рабілася, плата не ўнасілася, догляду ня было. Наадварот, бачучы такую прыхільнасьць камгасу да іх, прыватнікі самі ад сябе здавалі сады ў арэнду, бяручы не малыя прыбыткі.

Ніколі і не падумаў камгас нават праверыць выкананьне сваіх дагавораў.

З зямлёю бывалі яшчэ больш абураючыя факты. Дзе гэта бачылі людзі, каб 16 дзесяцін зямлі здаваліся ў арэнду за плату ў 175 руб. у год? Па чырвонцу дзесяціна! Яшчэ-б ня дзіўным было, каб за гэтую плату зямля здавалася ў арэнду бедняку. А яна-ж здавалася прыватніку, спэкулянту, гандляру.

У сэнсе вызваленьня ад розных падатковых пеняў гэты камгас як-бы згаварыўся з Бабруйскім. Нядоімак за прыватнікамі налічваецца да 300 руб. шмат пеняў камгас „прабачыў" прыватніку. Мала гэтага, нават прысуджаныя з прыватнікаў грошы гаркамгас не сабраўся спагнаць.

На працягу цэлых пяці год Слуцкі гарадзкі камгас патураў прыватніку, узяўшы іх пад сваю матчыну апеку.

За гэтыя гады некалькі тысяч рублёў страт атрымала камунальная гаспадарка Слуцку.

Калі Бабруйскі гарсавет прымірэнцкі адносіўся да шчодрасьці свайго камгасу ў сэнсе здыманьня пеняў з прыватнікаў, дык старшыня Слуцкага камгасу гэтыя „мерапрыёмствы" праводзіў уласнаю рукоў. Без усялякіх падстаў, адным росчыркам пяра, прыватнік атрымоўваў патрэбную яму рэзалюцыю аб зьняцьці пені.

Да гэтага простага праяўленьня правага ўхілу, да гэтага простага патураньня прыватніку трэба яшчэ дадаць, што ў Слуцкім камгасе і з грашовымі справамі ня ўсё ў парадку Крыбаўці да пэнсіі бяз усякіх падстаў, выдаче грошай за нейкі 20-30 днёў нескарыстаны воднуск, невядома кім устаноўлены, тут практыкаваліся шырока.

З-за ўсяго атрымаўся бюджэтны правал: прыбытковая частка не пакрыла выдатковую.

Бюро гаркому г. Бабруйску вынесла сваю аўтарытэтную пастанову па справе Бабруйскага камгасу. Праваўхілэнцы з Слуцкага камгасу заслугоўваюць яшчэ большай партыйнай і савецкай кары.

А. Дамброўскі.

Партбілет і ашуканства.

Партбілет і ашуканства—дзьве супроцьлегласьці, але яны з пасьпяховасьцю могуць сумяшчацца ў адной асобе.

Возьмем да прыкладу старшыню Старасельскага с.-с.. Копыскага р-ну, Аршанскай акругі, Мільту Рамана. Пры вучоце аб'ектаў абкладаньня ў гэтым годзе ён захаваў 5,3 дз. зямлі.

Беднята вёскі Гарадок падала заяву аб гэтым у РВК і загадчык фінчасткі выкрыў злоўжываньне Мільты.

Старшыня застаўся не пакараны. Райвыканком не праверыў практыку ападаткаваньня.

А хто-ж можа даць гарантыю, што Мільта не садзейнічаў укрыцьцю замлі ў другіх гаспадарках, у сваякоў, кумоў і проста „знаёмых"?

Гаспадарка яго бацькі складаецца з 11,8 дз. зямлі, каня і каровы; мае добрыя будынкі і сад; тры чалавекі з сям'і служаць у розных установах. І, ня гледзячы на гэта, Мільта Раман лічыцца батраком. У катэгорыю батракоў ён запісаўся таму, што калісьці працаваў адзін год на машына-ма тацельным пункце хут. Валышка. У якасьці старшага рабочага і адначасова з гэтым лічыўся ў гаспадарцы бацькі.

Ня гледзячы на тое, што на Мільту маецца цэлы шэраг заяў аб укрыцьці сацыяльнага становішча, райком партыі і райвыканком да гэтага часу к такому ашуканству ня прымаюць ніякіх мер.

Псэўданім.

Ёсьць скрыўленьні клясавай лініі

(Польскі сельсавет імя Мархлеўскага).

Нашы дасягненьні.

Мархлеўскі польскі сельсавет Аршанскае акругі мае шмат дасягненьняў у палітычным, гаспадарчым і культурным становішчы. Ня гледзячы на малую колькасьць камуністаў палітычная праца разьвіваецца і мае посьпехі, аб чым можа сьведчыць і тое, што ў адказ на падзеі на ВК чыгунцы і белабандыцкія напады на нашу тэрыторыю, працоўнае сялянства ў гэтым сельсавеце дало на ўзмацненьне абароназдольнасьці СССР 17 коп збожжа снапамі і 10 пуд. жыта.

Зараз выканана заданьне распаўсюджаньня III-й пазыкі індустрыялізацыі на суму 500 руб. Зроблен зрух і ў справе калектывізацыі. Існуе малочная арцель, якая налічвае 146 пайшчыкаў і мае маслабойны завод, ёсьць мэлярацыйнае таварыства, камітэт узаемадапамогі арганізуе цэглянную арцель. У вёсках Каўрыжыня, Паканава і Сідэркава вынесена пастанова аб арганізацыі машынных таварыстваў. За самаабкладаньне ў вёсках Каўрыжыня куплена 2 малацілкі, а ў засьценку Быроўкі—машыны для ачысткі збожжа. Шматпольле ўводзіцца ў большасьці пунктах, але ня плянава, бо адсутнічае кіраўніцтва і толькі ў Дудакох уведзена васьмі-поллье, а зараз разьбіта на шматпольле і вёска Сідэркава.

Аграмінімум выконваецца добра, хоць ёсьць і перашкоды.

Неабходна адзначыць добрую працу сельскагаспадарчага гуртка ў беларускай вёсцы Красіна, які на вопытнай дзесяціне засеяў авёс і зараз меў такі ўраджай, якога ня было ў цэлым сельсавеце. Гурток нядаўна купіў калектыўна малацілку.

Культурнае абслугоўваньне бядняцкіх і серадняцкіх мас у сельсавеце ідзе шпаркім тэмпам. Ёсьць хата-чытальня, 3 польскіх школы, адна беларуская. З новага навучальнага году адчынена яшчэ адна польская школа ў вёсцы Сідэркава і II-гі камплект у Філатоўскай польскай школе. Зараз закуплена два будынкі для школ за самаабкладаньне. У 1930 годзе распачнецца пабудова плянавай двухкамплектнай школы за сродкі дзяржавы. Каб нашырыць у сельсавеце палітасьветную працу прэзыдыум Аршанскага АВК ухваліў пабудову ў сельсавеце будынку для хаты-чытальні, на якую па кашторысу 1930 г. павінна быць асыгнавана 10 тысяч руб.

Слаба арганізавана бедната.

Аднак-жа неабходна высьветліць і недахопы, якія ёсьць у сельсавеце. Ва ўмовах працы пансельсаветаў асабліва вялікая ўвага павінна быць зьвярнуцца на правядзеньне правільнай клясавай лініі, каб беднату вызваліць з-пад уплыву кулакоў, якія пад лёзунгам „нацыянальнага адзінства" імкнуцца праводзіць сваю шкодную лінію. Трэба канстатаваць, што ў Мархлеўскім сельсавеце яшчэ слаба арганізавана бедната.

Сельсавет і камітэт узаемадапамогі не вядуць сталай працы сярод беднаты. Аддзяленьне Слазенскай спажывецкай каапэрацыі мае нявыкарыставаныя 200 р. фонду на каапэраваньне беднаты, а Каўрыжынская малочная арцель — 100 руб. Камітэт узаемадапамогі ня лічыў патрэбным скласьці сьпіс, каб беднату каапэраваць. У час васеньняй пасеўкампаніі ня было дадзена арганізаванай дапамогі беднаце.

Грубае скрыўленьне клясавай лініі.

У складзе Каўрыжанскай малочнай арцел ёсьць былы жандар, пазбаўлены права голасу, і калі складаліся сьпісы аб прадстаўлёньні льгот па сельска-гаспадарчаму падатку для членаў арцелі, таксама ўключылі ў сьпісы і яго. Апроч таго, ёсьць там яшчэ членамі чатыры моцных кулакі. Сакратаром арцелі зьяўляецца кулак-індывідуальнік—Галькевіч. Праўленьне арцелі аддало Галькевічу борава, які каштуе 217 руб. З умовай калі на працягу 2-х гадоў бораў пакрые 100 штук матак, дык ён пераходзіць ва ўласнасьць Галькевіча. Пры гэтым арцель павінна выдаваць яму вотрубі і авёс на ўтрыманьне борава".

Кулак Быліна не дастаўляе арцелі малака на пакрыцьцё атрыманых вотрубей.

Ад Галькевіча адрэзана сенажаць, з якога вучастку наізелена арцель.

Галькевіч раней проста адчуваў сябе „гаспадаром" у арцелі, калі быў сакратаром.

Трэба адзначыць, за апошнія два месяцы дзейнасьць арцелі зусім паслабла і ёсьць факты бесгаспадарчасьці.

Але яшчэ ня ўсё. Сэкратар мэліярацыйнай Брылаўскай арцелі Акшэўскі Адам купляў мінэральнае ўгнаеньне для арцелі і перапрадаваў кулакам.

Купленымі машынамі за самаабкладаньне распараджаецца таксама Акшэўскі. Гэтыя машыны стаяць пераважна ў кулака Быліны, які імі і карыстаецца.

Гэткае-ж зьявішча мы маем у засьценках Каўрыжыня, дзе была куплена малацілка за самаабкладаньне і якая ўвесь час стаіць у кулака Красоўскага, які нават зьяўляўся ўпаўнаважаным лясамі мясцовага значэньня.

Можна было-б яшчэ шмат прывесьці фактаў, якія гаворацьць аб скрыўленьні клясавай лініі ў гэтым сельсавеце. Да апошняга часу сельсавет не прадставіў яшчэ сьпісаў у РВК на прадстаўленьне льгот па сельскай гаспадарцы, якія прадугледжаны для тых вёсак і гаспадарак, якія выканалі аграмінімум. Але за тое падатковая камісія сельсавету ўжо разглядзела скаргі індывідуальнікаў-кулакоў і нават пастанавіла хадайнічаць перад РВК, каб некаторых аслабаніць ча сткова або цалком ад індывідуальнага абкладаньня. Шмат беднаты аб гэтым ня ведае.

У с-с праводзіліся ў мінулым годзе абрэзкі кулацкіх гаспадарак і так „добра", што абрэзаную зямлю ад кулака Быліны ня хоча браць беднота; зямля ляжыць аблогам. Але якая зямля. Самая горшая, а лепшую пакінулі кулакам.

Можна канстатаваць, што гэтыя выпадкі зьяўляюцца вынікам адсутнічаньня ў сельсавеце парткіраўніцтва як з боку партыйнай ячэйкі, таксама і камсамольскай. Ці можа добра праводзіць лінію партыі ў вёсцы такая камсамольская ячэйка, у якой сакратаром зьяўляецца моцны серадняк які судзіўся за падрабленьне дакумэнтаў. Бюро ячэйкі прыймала ў камсамол перважна моладзь серадняцкую. Камсамольцы ў большасьці не выяўляюць сябе ў палітасьветнай працы.

З боку Талачынскага выканкому ўжо прыняты некаторыя пастановы па гэтых справах.

Атахэль.

Няўважлівыя адносіны да спраў чырвонаармейцаў.

(Аршанская акруга).

Жонка чырвонаармейца Лаўрэнава з Коханаўскага раёну не атрымоўвала хлеба, а інвалід вайны Крывіцкі з Чарэйскага раёну ніяк ня мог дабіцца пэнсіі па інваліднасьці.

Каб высьветліць прычыны чаму не даюць хлеба сям'і чырвонаармейца і пэнсіі інваліду, акрыканком даручыў гэтыя справы адмаддзелу, запрапанаваўшы скончыць іх як мага хутчэй. Аднак-жа адмаддзел гэтыя справы пратрымаў каля двух месяцаў і толькі тады выявілася сапраўднае становішча, што пэнсію інваліду і хлеб жончы чырвонаармейца патрэбна даць. Такое доўгае высьвятленьне справы ў міліцыі здарылася дзякуючы таму, што начальнікі раённых міліцый адносіліся да справы фармальна, фіксіравалі факты, а прапаноў тым установам, якія ня выконвалі дырэктыў аб забясьпечаньні сямей чырвонаармейцаў,—ня выносілі.

Разглядаеўшы ўсё гэта, прэзыдыум акрыканкому вынёс пастанову запрапанаваць Чарэйскаму райвыканкому выдаваць пэнсію інваліду Крывіцкаму з 1 верасьня гэтага году, а ўсю справу аб валакіце і няўважлівых адносінах да справы сям'і чырвонаармейца і інваліда перадаць уРСІ для прыцягненьня вінаватых да адказнасьці.

А.

Аб палітычным значэньні калдагаворнай кампаніі і задачах масавай работы.

Я. Смалянскі.

Калдагаворная кампанія ў гэтым годзе набывае асабліва важнае значэньне. Яна павінна зьявіцца ў сучасных умовах рэканструкцыйнага пэрыяду адным з важнейшых фактараў і выхадным пунктам для цэлага году работы па мабілізацыі рабочых мас на вырашэньне вялізарных гаспадарчых задач, якія стаяць перад рабочай клясай нашай краіны, на зьнішчэньне вялікіх цяжкасьцяў першых год рэканструкцыі.

Масавая агітацыйная работа мае ў калдагаворы магутны сродак для таго, каб узьняць актыўнасьць рабочай масы на вышэйшую ступень, якой патрабуюць умовы рэканструкцыйнага пэрыяду.

У калдагаворнай кампаніі мы маем магчымасьць яшчэ больш узьняць клясавую сьвядомасьць і актыўнасьць у будаўніцтве нерадавых пралетарыяў, супрацьпаставіўшы вытворчы энтузіязм рабочага, які зразумеў, што ён гаспадар краіны і прадпрыёмства, рвачаскім, хвасьцішкім тэндэнцыям і адсталым настроям выхадцаў з дробнабуржуазных пластоў насельніцтва, а таксама старых рабочых, якія паддаюцца гэтым настроям. Гэтага масавая растлумачальная работа не рабіла ў мінулых калдагаворных кампаніях, ды і наогул ня ўмее яшчэ рабіць.

Толькі некаторыя прадпрыёмствы (на Ўрале, напрыклад) здолелі пытаньне аб прадукцыйнасьці працы і зарплаце ў праблеме сабекошту зрабіць рухавіком масавай работы і яе вынікаў—актыўнасьці рабочых у гаспадарчым жыцьці прадпрыёмства. Між тым, у галіне выкананьня якасных паказальнікаў пляну за мінулы гаспадарчы год мы значна адсталі. Намечаны рост прадукцыйнасьці працы на 1929-30 г. у 23 проц. пры росьце зарплаты ў 13-14 проц.—вось дзьве асноўныя лічбы, на разуменьні ўзаемазалежнасьці якіх (росту зарплаты ад росту прадукцыйнасьці) неабходна грунтаваць зьмест масавай растлумачальнай работы, якая паказвае ролю і месца прадпрыемства, цэху і кожнага рабочага ў справе выкананьня пяцігадовага пляну сацыялістычнага будаўніцтва.

Рабочая маса павінна ведаць тыя цяжкасьці, што стаяць перад нашай гаспадаркай і, у прыватнасьці, перад кожным прадпрыемствам. На гэтых цяжкасьцях рабочая маса павінна навучацца па бальшавіцку перамагаць перашкоды. Масавая растлумачальная работа павінна стварыць такія ўмовы, пры якіх праваапартуністычны дёзунг „раўнаньня на вузкія месцы" ня меў бы практычнага выяўленьня ў рабочым асяродку ў выглядзе пасыўных адносін да цяжкасьцяў сярод паасобных груп рабочых, нават партыйцаў.

Задачу клясавага выхаваньня масавая агітацыя ў калдагаворную кампанію павінна вырашаць, мабілізуючы ўвагу і арганізуючы сілы рабочых прадпрыемства вакол задач данае вытворчасьці (паказальнікаў прамфінпляну, пяцігадовага пляну прадпрыемства).

Было-б аднак няправільна з такой устаноўкі масавай агітацыйнай работы ў калдагаворнай кампаніі рабіць вывад, што пытаньні матар'яльнага становішча рабочых павінны быць у ёй адсунуты на другі плян. Пытаньні матар'яльна-бытавога характару тым больш заслугоўваюць увагі, што, як паказвае вопыт праверкі выкананьня дагавораў, найбольшы процант выкананьня ня ўмоў калдагавораў прыпадае якраз на пункты, якія датычацца аховы працы, быту і павышэньня культурнага ўзроўню рабочых, што ня можа не адбіцца на ўдзельнай вазе калдагавораў наогул у вачох рабочых.

Тут трэба наогул закрануць пытаньне аб праверцы выкананьня калдагавораў.

Вельмі часта праверка выкананьня калдагавораў лічыцца справаю толькі вузкага кола прафработнікаў, апарату фабкому, а ня ўсёй рабочай масы. Трэба вывяць прычыны нявыкананьня калдагавораў і на гэтай глебе стварыць у рабочым асяродку поўную грамадзкую думку па лініі перазаключэньня дагавору.

Самай буйнай і недапусьцімай памылкай было-б праводзіць кампанію перазаключэньня калдагавораў адарвана ад бягучых гаспадарча-палітычных задач. Уменьне зьвязаць калдагаворную кампанію з пытаньнямі пераходу на бесперапынны вытворчы тыдзень, з пытаньнямі сацыялістычнага спаборніцтва з пытаньнямі ўдзелу рабочай клясы ў хлебазагатоўках, з пытаньнямі падпіскі на 3-ю пазыку індустрыялізацыі—будзе зьяўляцца паказальнікам таго, наколькі нізавыя арганізацыі перамагаюць элемэнты бюракратызму, шаблёну ў сваёй масавай рабоце.

Пры ўтварэньні калдагавораў трэба растлумачыць палітычнае і гаспадарчае значэньне пытаньня аб бесперапынным вытворчым тыдні. Бесперапынны вытворчы тыдзень перабудоўвае вытворча-бытавыя ўмовы рабочага. Мэтад спаборніцтва павінен быць ужыты і пры самым утварэньні калдагавораў. Адзін цэх можа выклікаць другі на павялічэньне нормы ці зьніжэньне проценту браку ў калдагаворы і інш.

У калдагаворнай кампаніі масавая работа павінна ахапіць усіх рабочых без выключэньня.

Такі падыход прад'яўляе шэраг патрабаваньняў і да самага калдагавору (просты і зразумелы рабочаму спосаб тлумачэньня) і да масавай растлумачальнай работы. Трэба са ўсёй рашучасьцю зьнішчыць у апошняй бюракратычныя шаблёны і няўважлівыя адносіны да масы.

Беспартыйны рабочы актыў павінен быць падрыхтаваны да правядзеньня лініі партыі ў калдагаворнай кампаніі ў беспартыйнай рабочай масе ва ўсіх гэтых мясцох, дзе здараюцца часамі больш гарачыя сутычкі, чымся на сходах. Падрыхтоўчая работа павінна быць праведзена і сярод партыйцаў. Адсутнасьць належнай інфармацыі партыйцаў можа толькі спрыяць хвасьцісцкім тэндэнцыям сярод іх.

Ня трэба, аднак, абмяжоўвацца толькі спэцыяльным інструктаваньнем партыйцаў. Уся партыйна-выхаваўчая работа павінна абярнуцца „тварам да калдагавораў".

Калектыўныя дагаворы да гэтага часу ў вельмі слабай ступені аддавалі сваю ўвагу задачам узьдыму культурна-палітычнага ўзроўню рабочых.

У калектыўныя дагаворы трэба ўключаць спэцыяльныя пункты аб ліквідацыі нянісьменнасьці і малапісьменнасьці рабочых і работніц. Такія-ж абавязацельствы гаспадарчых і прафсыйных арганізацый трэба ўключыць у калдагавор і па арганізацыі прафтэхкурсаў, тэхнічных гурткоў, курсаў перакваліфікацыі, узмацненьня фабзавучу і фабрычна-заводзкай сямігодкі і г. д.

Асобнае месца ў кампаніі перазаключэньня калдагавораў павінен заняць друк як фабрычна-заводзкі (насьценныя і друкаваныя газэты), так і масавы рабочы. Таксама, як і ў сацыялістычным спаборніцтве, ён павінен паказаць як узоры сьвядома-клясавага падыходу да ўтварэньня калдагавору, так і адсталага цэхавага падыходу, фармуючы вакол іх грамадзкую думку рабочых.

Вельмі важна на першай стадыі кампаніі ў друку (асабліва заводзкім) паставіць інфармацыю аб праверцы выкананьня калдагавору, мабілізуючы вакол гэтай задачы сілы рабкораў, сьценкораў і інш.

Адносіны да калдагаворнай кампаніі, як да работы спэцыяльна-тарыфных работнікаў—гэта-ж па сутнасьці і ёсьць праява вузка-цэхавых тэндэнц

Супроць талесу, рызы і сутаны.

Замест надыходзячых рэлігійных оргій—узмацнім тэмп працы на карысьць індустрыялізацыі краіны.

НІВОДНАГА ПРАГУЛУ Ў ДНІ РЭЛІГІЙНЫХ СЬВЯТАЎ!

Рэлігіі ня ўдасца схаваць свой клясавы твар.

Царкоўнікі разгортваюць барацьбу супроць сацыялістычнага будаўніцтва сярод веруючых усіх рэлігій. Рабін, поп, ксёндз—кожны з іх выконвае адну задачу—задачу атручвання сьвядомасьці працоўных ядам рэлігіі.

З 2 да 25 кастрычніка адбудзецца цалая сэрыя рэлігійных сьвят іудзейскай рэлігіі: новы год, судны дзень, купчы. У гэтыя дні духоўнікі падлічваюць свае сілы, зьбіраюць усіх, каго зможуць, у сінагогі і рознымі байкамі імкнуцца замацаваць свой уплыў на працоўных. Шавіністы ўсіх масьцей будуць лямантаваць і заклікаць працоўных яўрэяў пакаяцца ў сваім інтэрнацыяналізьме. Больш 20 дзён у сінагогах будзе гучэць прапаведваньне клясавага міру і пакорлівасьці. Да паслухмянасьці і падпарадкаваньня пазнану і скупчыку будзе заклікаць рабін у сваіх казаньнях яўрэйскага рабочага, яўрэйскага служачага і саматужніка. Байкай аб дараваных грахох рабіны будуць спрабаваць утрымаць масы ў падначаленьні сабе.

Працоўныя яўрэі павінны прысьвяціць гэтыя дваццаць дзён правядзеньню шырокай антырэлігійнай кампаніі.

Мінулая кампанія супроць сьвяткаваньня вялікадня дала яскравы ўзор барацьбы супроць рэлігійных сьвят.

Па ўсёй Беларусі, як і па іншых рэспубліках Саюзу, у гэтыя сьвяточныя дні яўрэі-рабочыя выйшлі на працу, працавалі ў сваіх майстэрнях саматужнікі, працавалі сяляне. Школьнікі зьявіліся ўсе як адзін на заняткі. Процант наведваньня школ быў вышэйшы, як у звычайныя дні.

Адхаўленьне ад сьвяткаваньня вялікадня зьяўлялася вынікам нарастаньня антырэлігійных настрояў.

Сінагога а кожным днём траціць свой былы аўтарытэт. А зараз на ўсім Саюзе і па Беларусі ідзе хваля зачыненьня сінагог.

Клерыкалізм і рабіны змагаюцца і будуць змагацца да апошняга з камунізмам, з сусьветным Кастрычнікам, з бязбожжам. Усюды, дзе толькі магчыма, ён выступае супроць СССР, супроць працоўных. Штодзённая контрэвалюцыйная агітацыя, байкот бязбожнікаў і тых, што хістаюцца, аказаньне матар'яльнай дапамогі веруючым, саюз з капіталам за межамі, паклёпніцкія кампаніі і г. д.—усе сродкі пускаюцца ў ход. Яскравым прыкладам гэтага можа служыць зноў-такі мінулы вялікдзень Поп-ман, рабіны і клерыкалы зьвярнуліся за межы з просьбаю дапамагчы „галадаючым яўрэям" і прыслаць у СССР мацу.

Тады ў руку капіталу адыграў іудзейскі клерыкалізм сваім „зваротам" дапамагчы ў дні вялікадня „галадаючым яўрэям". Гэты зварот паслужыў поводам да ўзмацненьня прапаганды супроць нас. Яны дасканала ўлічвалі, што пасылка мацы ўзьніме хвалю антысэмітызму. Капіталістам і клерыкалам антысэмітызм зручны, бо яны ведаюць, што ўсе контррэвалюцыйныя элементы ў СССР спрабуюць на разьвіцьці і паглыбленьні антысэмітызму мабілізаваць вакол сябе ўсіх тых, хто супроць савецкай улады.

Клерыкалізм падтрымлівае ўсякія формы яўрэйскага шавінізму, прапаганду нацыянальнай адмежаванасьці, сіяніізм і гэтым самым усімі спосабамі імкнецца затрымаць практычнае ажыцьцяўленьне нацыянальнай палітыкі камуністычнай партыі.

Капіталісты—супроць вызваленьня працоўных, яны—за аб'яднаньне капіталістаў усяго сьвету. У Амэрыцы яўрэй-банкір Розэнвальд ахвяруе сотні тысяч даляроў на хрысьціянскія царквы, багацей-яўрэй Пазнанскі ў Лодзі пабудаваў каталіцкі касьцёл. А мітрапаліт Антоні Храпавіцкі з прадстаўнікамі яўрэйскіх буржуазных эмігрантаў на замежным манархічным зьезьдзе ў 1926 годзе абмяняўся пацалункамі.

Яшчэ і яшчэ раз трэба паўтарыць, што ўсе рэлігіі аднолькавыя. Няма ні лепшай, ні горшай рэлігіі. Няхай яна апранаецца ў талес, у рызу, у сутану,—ня ўдасца ёй схаваць свой сапраўдны клясавы твар.

У надыходзячыя асеньнія сьвяты саюз ваяўнічых бязбожнікаў павінен правесьці шырокую антырэлігійную кампанію. Усе працоўныя яўрэі павінны працаваць у гэтыя дні, каб яшчэ раз падкрэсьліць сваю нянавісьць да капіталу і яго паслугача—клерыкалізму.

Будзе вялікай палітычнай памылкай, калі мы гэту кампанію абмяжуем выключна яўрэйскім асяродкам. Іменна выхадам за межы яўрэйскага асяродку, іменна ўцягненьнем у кампанію ўсіх працоўных будзе на справе паказана інтэрнацыянальная салідарнасьць працоўных, якія змагаюцца за культурную рэвалюцыю, за пяцігодку, за сацыялізм.

ПРАЦОЎНЫМ НЕПАТРЭБНЫ РЭЛІГІЙНЫЯ ОРГІІ.

Антырэлігійная кампанія ў оўязі з надыходам яўрэйскіх сьвятаў праводзіцца пад лёзунгам: „ПРАЦУЕМ У ДНІ РЭЛІГІЙНЫХ СЬВЯТ, КАБ ПАСКОРЫЦЬ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫЮ КРАІНЫ".

Антырэлігійная праца за апошні час значна ўзмацнілася. Праведзена нарада культпрацаўнікоў, дзе шырока абгавораны мэтады і формы антырэлігійнай працы ў часе рэлігійных сьвятаў.

На фабрыках, заводах і ўстановах заараз праводзіцца ў часе абедзеных перапынкаў гутаркі аб шкодлівасьці рэлігіі. У сваіх рэзалюцыях рабочыя заўважаюць:

„АДМАЎЛЯЕМСЯ АД РЭЛІГІЙНЫХ СЬВЯТ. ЗАМЕСТ ІХ БУДЗЕМ ПРАЦАВАЦЬ У ФОНД ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ НАШАЙ КРАІНЫ".

Вось сводка рашэньняў працоўных яўрэяў:

— НАРАДА САМАТУЖНІКАЎ пастанавіла 2-гі дзень „Рош-Гашона" адпрацаваць у карысьць пабудовы самалёту „Самаатужнік Беларусі". У „судны дзень"—„Іом-Кіпур" ухалена правесьці дзень Індустрыялізацыі.

— СХОД ЯЎРЭЙСКІХ РАБОЧЫХ І РАБОТНІЦ САЮЗУ НАРХАРЧАВАНЬНЯ ўхваліў працаваць на ўсе дні рэлігійных сьвятаў.

Пастанавілі працаваць і рабочыя заводаў „Камунар", „Чырвоная Зорка", Меншвэй" і інш.

— НА СХОДЗЕ РАБОЧЫХ ВОЙЛАЧНАЙ Ф-КІ І ТЭКСТЫЛЬШЧЫКАЎ ухвалена адлічыць адзін процант з заработкаў у рэлігійныя сьвяты на карысьць пабудовы самалёту „Біраібджан".

На рабочых клюбах праводзіцца шмат людных антырэлігійных вечараў.

Асабліва пасьпяхова наладжана антырэлігійная праца сярод саматужнікаў: яны ўжо правялі звыш 10 сходаў-вечараў.

Нядаўна адбыўся СХОД ЯЎРЭЙСКІХ НАСТАЎНІКАЎ, КУЛЬТПРАЦАЎНІКОЎ І БІБЛІАТЭЧНЫХ ІНСТРУКТАРОЎ. Ухвалена, каб у часе сьвятаў працавалі нармальным тэмпам. Па школах зараз праводзіцца гутаркі сярод дзяцей і бацькоў па пытаньню аб шкодлівасьці рэлігіі і яе контррэвалюцыйнай ролі.

Гэтымі днямі для працоўнага насельніцтва Камароўкі быў наладжан ВЯЛІКІ АНТЫРЭЛІГІЙНЫ ВЕЧАР, дзе шырока быў абгаворан даклад аб барацьбе з клерыкалізмам.

У РАЙЁНЫ МЕНСКАЙ АКРУГІ накіравана брыгада дакладчыкаў для ўзмацненьня антырэлігійнай працы.

УВЯЗАЦЬ АНТЫРЭЛІГІЙНУЮ КАМПАНІЮ З ЗАДАЧАМІ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА

Менскі акруговы Савет Бязбожнікаў зацьвердзіў плян правядзеньня антырэлігійнай працы ў сувязі з яўрэйскімі асеньнімі рэлігійнымі сьвятамі (Рош-Гашон, Іом-Кіпур, Сукэс).

Кампанія праводзіцца пад лёзунгамі барацьбы з яўрэйскім шавінізмам і клерыкалізмам, супроць старых рэлігійных традыцыяў. За новы культурны безрэлігійны быт, за сацыялістычнае будаўніцтва.

Для правядзеньня кампаніі вылучана брыгада дакладчыкаў.

Па ўсіх райённых саветах бязбожнікаў накіраваны інструктыўныя лісты з практычнымі ўказаньнямі аб правядзеньні гэтай кампаніі.

У дні рэлігійных сьвят па ўсіх клюбах, вардомах, хатах-чытальнях, (асабліва на акраінах гораду і ў мястэчках), на прадпрыёмствах і па ўстановах будуць праведзены лекцыі і гутаркі антырэлігійнага зьместу на тэмы: „інтэрнацыянальнае выхаваньне" „значэньне рэлігійных сьвят і сацыялістычнага будаўніцтва", „аб барацьбе з яўрэйскім шавінізмам і клерыкалізмам" і інш. Усе гэтыя патаньні павінны быць увязаны з пытаньнямі індустрыялізацыі краіны, сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі, з сацыялістычным спаборніцтвам.

Па ўсіх школах будуць праведзены кароткія гутаркі і лекцыі аб значэньні і клясавай сутнасьці рэлігійных сьвят і рэлігіі ноогул. Будуць праведзены супольныя антырэлігійныя вечары—сходы бацькоў і вучняў.

Радыё-станцыя ў часе кампаніі правядзе шэраг дакладаў антырэлігійнага зьместу.

Калгасы--асяродак будаўніцтва безрэлігійнага быту.

Правядзём масавыя экскурсіі ў яўрэйскія калгасы.

(Сьмілавічы, Меншчына).

У сувязі з надыходам яўрэйскіх рэлігійных сьвятаў у нашым райёне значна ўзмацнілася антырэлігійная праца. Нядаўна ў м-ку быў праведзен масавы антырэлігійны вечар, дзе апрача працоўных яўрэяў прысутнічалі і працоўныя іншых нацыянальнасьцяў.

Да сьвятаў ладзіцца спэцыяльны антырэлігійны нумар насьценгазэты.

Праведзена райённая нарада культпрацаўнікоў, дзе шырока абгаварвалася пытаньне аб мэтадах і формах антырэлігійнай працы.

У часе яўрэйскіх сьвят будуць праведзены масавыя выезды сялян у яўрэйскія калгасы „Новае Жыцьцё", „Прагрэс" дзеля азнаямленьня з дасягненьнямі калгаснага будаўніцтва і земляўпарадкаваньня працоўных яўрэяў. Рабочыя гэтых калгасаў заявілі, што ў часе рэлігійных сьвят праца ў іх будзе ісьці без перабояў. Ч-ы.

ПА БЕЛАРУСКАЙ ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Хлеб ідзе...

(Бабруйская акруга).

Тэмп загатовак на Бабруйшчыне праходзіў слаба. Аб гэтым сьведчыць тое, што ліпеньска-верасьнеўская хлебазагатавіцельная праца дала толькі 50 проц. выкананьня агульнага пляну загатовак. У апошні час справа шпарка пайшла ўперад, шырока разгарнулася калектыўная здача хлеба сялянствам, і лічбы загатовак гаворань аб шпаркім і посьпяховым тэмпе хлебазагатавіцельнай кампаніі. Калі, напрыклад, спажывецкая кааперацыя за ўвесь жнівень месяц загатовіла толькі 108 тон, дык за першую дзесяцідзёўку верасьня яна ўжо гэтую суму амаль што перавысіла.

Па ўсіх раёнах акругі ідзе калектыўная здача хлеба сялянствам. За адно толькі 14 верасьня па Парыцкаму раёну здадзена калектыўна сялянствам 800 пудоў хлеба, па Слуцкаму раёну—1000 пудоў, па Глускаму—2400 пудоў.

З вялікім уздымам праходзіць калектыўная здача хлеба. З чырвонымі сьцягамі ідуць абозы на ссыпныя пункты. Сяляне вёскі Парэчча, Бабруйскага раёну, прывезьлі ў якасьці падарунку Чырвонай армії у дзень яе зваротy з манэўраў 150 пудоў хлеба. У гэты самы дзень сяляне Продзьвінскага, Бортніцкаўскага, Міхалеўскага, Восаўскага, Сычкаўскага і Каменскага сельсаветаў, Бабруйскага раёну, даставілі ў горад з Чырвонымі сьцягамі 1140 пудоў хлеба.

Калектыўная здача хлеба перайшла на рэйкі сацыялістычнага спаборніцтва. Вёскі пераклікаюцца паміж сабою. Так, вёска Зубарэвічы, Глускага раёну, здаўшы 550 пудоў хлеба, выклікала на здачу хлеба суседнія вёскі Зіляковічы і Бярозаўку. Сяляне гэтых вёсак адказалі тым-жа.

За два тыдні ад 1 да 15 верасьня па Рагачэўскаму раёну паступіла па калектыўнай здачы 2200 пудоў хлеба. Калектыўная здача хлеба захапіла далёкія куткі Бабруйшчыны і з кожным днём тэмп яе пашыраецца.

Варатынскі сельсавет арганізаваў здачу хлеба і выклікаў Кавалёўскі сельсавет на спаборніцтва. Апошні ў адказ на выклік паставіў перад сабою задачу дабіцца 180 процантнага выкананьня заданьня, якое дадзена сельсавету па загатоўках.

Паступленьне памольнага збору таксама ідзе здавальняюча. Але, ня гледзячы на пасьпяховы ход загатовак, у гэтай працы зазначаюцца ненармальнасьці. Так, напрыклад, Саюзхлеб, які павінен праводзіць загатоўкі па сваіх пунктах у Слуцку, Бабруйску і Рагачэве, імкнецца „захапіць" сваёю дзейнасьцю сельскія мяйсцовасьці. У некаторых мясцох, як напрыклад, Слуцку, Саюзхлеб перакінуў сваю дзейнасьць на вёску. Тут-то і саюзхлебаўцы распаяселіся, дашлі да таго, што пачалі агітаваць, каб сяляне здавалі хлеб па калектыўнай здачы толькі ім. Пачалася канкурэнцыя. Саюзхлеб пачаў плаціць даражэй за хлеб.

У паступленьні памольнага збору зазначаюцца імкненьні млынароў абыйсьці закон ураду, паменшыць суму памольнага збору.

Тут можна чакаць такое зьявы, што апарат Саюзхлебу ня справіцца з кантролем над млынамі. Адсюль зразумела, што на дапамогу яму павінны прыйсьці мясцовыя органы. А. Дамброўскі.

Не спаборніцтва, а валакіта.

Калектыў супрацоўнікаў Магілеўскага аддзяленьня Лесбелу 16-Ў г. г. выклікаў на сацыялістычнае спаборніцтва па цэламу шэрагу пытаньняў паляпшэньня рахункаводнай і іншай працы супрацоўнікаў Гомельскага аддзяленьня Лесбелу і апошнія выклік нібы-та прынялі, але-ж калі Магілеўскімі супрацоўнікамі быў распрацован і падпісан дагавор і дасланы ў Гомель для афарміленьня, дык гэты дагавор марынуецца ў Гомлі ўжо больш 2 месяцаў.

Між іншымі, у дагаворы маецца пункт на зьнішчэньне валакіты, а тут выходзіць, што Гомельскі калектыў Лесбелу ўтварае валакіту ў самім афарміленьні дагавора.

Напамінак мясцкому ад 26 жніўня таксама астаўлен без увагі. Рабкін

Распачата масавая праверка гасп.-паліт. дагавораў.

Барысаў, 3-Х. На буйнейшых прадпрыёмствах «Чырвоная Бярэзіна» і „Домбаль" распачата масавая праверка гаспадарча-палітычных дагавораў па сацыялістычнаму спаборніцтву. Вядзецца падрыхтоўка да заключэньня новага палітычнага дагавору на 1929-1930 г. Для жыцьцяўленьня капкрэтных мерапрыемстваў у правядзеньні агляду ў Барысаў прыбылі прадстаўнікі ЦК і ЦП саюзу хімікаў.

57 земляўпарадкаваных калгасаў.

ГОМЕЛЬ, 3-Х. Сёлета ўсе земляўпарадкавацелі былі скарыстаны на земляўпарадкаваньне калгасаў. У выніку на 10 верасьня скончана земляўпарадкаваньне ў 39 калгасах і ў бліжэйшыя дні будуць земляўпарадкаваны яшчэ 18 калгасаў.

Трэба адзначыць, што ў большасьці раёнаў земляўпарадкваццелі былі прадастаўлены самі сабе. Грамадзкія арганізацыі слаба дапамагалі ім у іх рабоце. У асобных раёнах райвыканкомы да гэтага часу не заслухалі дакладаў земляўпарадкавацеляў.

Лепельшчына дрэнна распаўсюджвае пазыку.

Полацак, 2-Х. Распаўсюджваньне 3-й пазыкі індустрыялізацыі па акрузе ў асноўным праходзіць здавальняюча. Але некаторыя райёны адносяцца да гэтай справы дрэнна, нават ня складалі вакол гэтага пытаньня грамадзкай думкі, шэраг вёсак ня ведаюць пра пазыку.

Напрыклад, па Лепельскаму райёну сярод сялянства распаўсюджана пазыкі толькі на 300 руб. Райённыя працаўнікі глядзяць на гэтую кампанію з прахладцам. Па вёсках не праведзена належнай агітацыйна-растлумачальнай працы. Некаторыя сяляне зусім ня ведаюць пра карысьць пазыкі.

Усёй грамадзкасьці Лепельскага райёну трэба палепшыць працу, каб выкананьць заданьне па распаўсюджваньню пазыкі сярод сялянства, бо такія адносіны да справы ставяць кампанію пад пагрозу зрыву.

Як скарыстоўваюцца сродкі ад самаабкладаньня.

Полацак, 3-10. Па акрузе налічана на 1928-29 г. 134672 руб. самаабкладаньня грашыма і 106030 руб. -працай.

На 1 верасьня грашыма паступіла 107763 руб. і працай—на 1739 руб. Выдаткавана грашыма 46776 руб. і працай 1739 руб. Некаторыя райёны нядбайна адносяцца да сваечасовага ўнясеньня самаабкладаньня, што ставіць гэта мерапрыёмства пад пагрозу зрыву.

Неабходна зьвярнуць асаблівую ўвагу на хутчэйшае скарыстаньне паступіўшых ад самаабкладаньня сродкаў.

Работу ўстаноў на дзьве зьмены.

Полацак, 4-Х. Адзін з рабкораў унёс прапанову на старонках акруговай газэты, каб па прыкладу цэнтральных устаноў перавесьці працу некаторых устаноў у горадзе на дзьве зьмены. Гэтым самым мы можам зьнішчыць жыльлёвы крызіс, асабліва сярод студэнцтва гораду.

Акруговым арганізацыям трэба такую прапанову правесьці ў жыцьцё, бо яна набывае ў нашых умовах асаблівую важнасьць. С.

Будаўніцтву сувязі пагражае зрыў.

Ворша, 3-10. Аршанская кантора сувязі распачала пабудову другога паверху свайго памяшканьня, але з прычыны таго, што праэкт пабудовы гэтага паверху некалькі разоў зьмяняўся, а з боку Беларускага Кіраўніцтва Сувязі за пабудовай ня было сталага тэхнічнага нагляду, будаўніцтву пагражае зрыў і невыкананьне ў вызначаны тэрмін.

Улічваючы гэта, прэзыдыум акрвыканкому запранаваў канторы сувязі прыняць усе захады, каб пабудова была скончана ў вызначаны тэрмін, а перад Бел. Кіраўніцтвам Сувязі паставлена пытаньне аб поўным забясьпечаньні будаўніцтва будаўнічымі матар'ялямі і сталым тэхнічным наглядам.

Выступілі ў дашкольна-культурны паход.

Полацак, 26-9. Гэтымі днямі грамадзкасьць Полаччыны выступіла ў вялікі дашкольна-культурны паход, які мае сваёй мэтай: стварэньне грамадзкай думкі вакол навучаньня ў школах, дапамогу школам, уцягненьне дзяцей беднаты ў школы і інш.

Акрінспэктарыят нарасьветы даў належныя паказаньні ўсім райёнам, якія таксама выступілі ў памянёны паход. Трэба сказаць, што гэты паход пры актыўным удзеле ўсёй грамадзкасьці прынясе вялікую карысьць і палепшыць культурна-выхаваўчую працу ў школах.

Разгарнулі працу.

(Меншчына).

Сьмілавіцкі райён дзейна рыхтуецца да дню ўраджаю і калектывізацыі. Удзел у падрыхтоўцы прымаюць усе грамадзкія арганізацыі, партыйныя і камсамольскія ячэйкі і вясковы актыў.

У дзень ураджаю ў райёне будзе арганізавана 5 буйных калгасаў у Дукорскім, Рудзенскім і Старынскім. Многія з існуючых калгасаў будуць узбуйнены за лік бядняцка-сераднякцкага сялянства.

У дзень ураджаю і калектывізацыі будуць праведзены агульныя сходы ў вёсках, калгасах з удзелам беднаты і акаляючых сялян. Асноўнае, на што зьвернута ўвага—гэта на ўзбуйненьне існуючых калгасаў і арганізацыю новых, ахапленьне падпіскай на 3 пазыку індустрыялізацыі ўсяго працоўнага сялянства. Значная ўвага аддаецца падрыхтоўцы да выстаўкі.

Сярод працоўнага сялянства і калгасьнікаў ідзе сталая падрыхтоўка да дню ўраджаю. Па с.-с будуць праводзіцца с-гаспадарчыя выстаўкі сялянскіх экспанатаў. Калгасы дадуць свае экспанаты.

У райёне будзе праводзіцца буйная выстаўка гатункових вытворцаў быкоў і другіх жывёл. Л.

Сялянскае агнятрывае будаўніцтва.

Бабруйск, 2-10. Ад пачатку будаўнічага сэзону на Бабруйшчыне сялянамі пабудована 9 агнятрывалых хат, прычым 3 хаты ў Парыцкім 4—у Слуцкім, 1—у Жлобінскім, 1—у Рагачэўскім і 1—у Бабруйскім райёнах. Да канца будаўнічага сэзону лік сялянскіх агнятрывалых хат дасягне 30. Сёлета ўпяршыню ў Слуцкім райёне практыкуецца пабудова бэтонных сялянскіх хат.

Затрыманы бандыты.

Магілеў, 2-10. Гэтымі днямі Крычаўская раймілiцыя затрымала вядомага на Магілеўшчыне бандыта Балахонава з братам і шваграм—Белавусавым.

Гэтая тройка пачала «апэраваць» у Магілеўскай акрузе ў 1927 г.

Летась банда была затрымана, пасьля шэрагу ўтвораных ёю ўзброеных рабункаў Расьнянскай міліцыяй. Але, зламаўшы краты, злачынцы ўцяклі.

Бандыты «спэцыялізаваліся» пераважна на рабунках каапэратываў. Юр.

Сацыяльнае забясьпечаньне палепшапца.

Ворша, 2-10. Кантрольныя лічбы на новы бюджэтны год прадугледжваюць значнае павялічэньне сродкаў на сацыяльнае забясьпечаньне насельніцтва Аршанскай акругі. На ўтрыманьне інвалідаў і на надбаўку сем'ям чырвонаармейцаў прадугледжваецца 159.000 руб., на пэнсіі чырвонаармейцам-інвалідам—8530 руб., на пэрсанальныя пэнсіі—6126 руб., на барацьбу з жабрацтвам—2700 руб., на пэнсіі састарэлым сялянам — 5.000 руб., на ўтрыманьне дамоў для інвалідаў —14.115 руб., на прыстасаваньне інвалідаў да працы—3450 руб. і на датацыю камітэтам узаемадапамогі—14.408 руб. Сродкі, у параўнаньні з мінулым годам, павялічваюцца на 50 проц.

Гэтыя лічбы гавораць, што сацыяльнае забясьпечаньне насельніцтва акругі ў будучым годзе будзе значна палепшана ў параўнаньні з мінулым.

У ШТУРМ СУПРОЦЬ НЕБА.

Выкрыць хлусьню яўрэйскага клерыкалізму.

Гутарка з нам. старшыні цэнтральнага Савету Бязбожнікаў Беларусі т. КСЕНЖУКОМ М. Я.

Яўрэйскія рэлігійныя сьвяты будуць у гэтым годзе адбывацца ва ўмовах абвастрэньня клясавай барацьбы і спробаў яўрэйскіх клерыкалаў і нацыянал-шавіністых узмацніць свой уплыў на адсталыя групы яўрэйскіх рабочых у бок утварэньня адзінага нацыянальнага фронту, каб аддягнуць рабочых ад задач сацыялістычнага будаўніцтва.

Неабходна разгарнуць шырокую работу па растлумачэньню рабочым і служачым сутнасьці і шкодлівасьці рэлігіі, якой прыкрываюцца клерыкалы і шавіністы ў барацьбе супроць сацыялістычнага будаўніцтва.

Уся антырэлігійная работа павінна быць увязана з задачамі выкананьня пяцігадовага пляну, сац. спаборніцтва і ўзьнаўленьня культурнага ўзроўню рабочых.

Антырэлігійная кампанія павінна быць скарыстана для шырокага растлумачэньня значэньня пераводу прадпрыёмстваў і ўстаноў на бесперарыўны працоўны тыдзень, што праведзена дзеля хутчэйшага ажыцьцяўленьня пяцігодкі.

У сувязі з рашэньнем Саюзнага СНК аб увядзеньні 5-дзённага тыдню, будуць вынішчаны рэлігійныя сьвяты.

Перад намі стаіць баявая задача яшчэ больш узмацніць антырэлігійную працу на фабрыках і заводах.

Трэба павесьці шырокую кампанію сярод рабочых і служачых за тое, каб у дні сьвята Рош-Гашона, Іом-Кіпур і Сукэс на ўсіх прадпрыёмствах і ва ўстановах праца праводзілася нармальным тэмпам. Неабходна імкнуцца да таго, каб гэта праца знайшла належны адбітак у дагаворах па сац. спаборніцтву.

Асабліва трэба завастрыць пытаньне аб працы ў дзень Іом-Кіпур.

У сувязі з антырэлігійнай кампаніяй трэба пашырыць працу па арганізацыі ячэяк „Бяжбожнік", уцягнуць у іхную актыўную дзейнасьць рабочых і служачых яўрэяў.

Адначасова з гэтым ячэйкі «Бязбожнік» на вёсках павінны быць актыўнымі дапаможнікамі партыі і савецкай улады ў правядзімых хлебазагатоўках, а таксама ў правядзеньні „дню ўраджаю і калектывізацыі".

ТОНКАЯ МЭХАНІКА.

Рэлігійныя сьвяты--перажытак дзікасьці, зброя нашага клясавага ворага.

Эканоміка вызначае напрамак разьвіцьця данай грамады на яе пэўнай гістарычнай стадыі. Ступень разьвіцьця вытворчых сіл фармуе ня толькі быт данай грамады, але і яе псыхіку, яе погляды і ў прыватнасьці і яе рэлігійныя перакананьні.

Гэту ўладу эканомікі над псыхікай чалавека асабліва выразна можна прасачыць, вывучаючы мінулае ўсіх рэлігій наогул і ў прыватнасьці іудзейскай рэлігіі.

У тую надзвычайна далёкую ад нас эпоху, калі яўрэі вялі вандроўнае жыцьцё, калі яны са сваімі статкамі вандравалі, шукаючы лепшых месц для пашы сваёй жывёлы, з адной краіны ў другую,—у тую далёкую ад нас эпоху і рэлігійныя сьвяты яўрэяў-вандроўнікаў адбівалі сабой іхнае вандроўнае жыцьцё.

Так, у вясеньняе сьвята вялікадня яны прыносілі духам у ахвяру ягнё, як сымбаль сваіх статкаў, як падачку духам, каб тыя ахоўвалі ў працягу ўсяго году гэтыя статкі ад мору і іншых няшчасьцяў.

Гэта сьвята вялікадню прыстасоўвалася да вясны менавіта таму, што вясна зьяўляецца сымбалем уваскрашэньня прыроды да новага жыцьця, бо якраз вясной у статках нараджаецца новы малады прыплод.

Потым, калі старажытныя яўрэі ад жывёлагадоўлі перайшлі да земляробства, калі такім чынам эканамічныя ўмовы іх жыцьця моцна зьмяніліся,—тады і вясеньняе сьвята вялікадня набывае яскрава выяўлены земляробчы характар.

У ахвяру богу-сонцу нясуць ужо ня толькі ягнё, але і жыта, і зярнят з якога пякуць прасныкі—мацу.

Гэта заколатае ягнё і гэту мацу, пасьля з адпаведнай цэрамоніі, зьядаюць прысутныя на служэньні земляробы.

Таксама і ўсе іншыя рэлігійныя сьвяты, у кожным разе значная большасьць з іх, ва ўсіх рэлігійных культах маюць пад сабой якую-небудзь эканамічную падставу, тлумачацца адпаведнымі звычаямі жыцьця грамады на данай ступені яе гістарычнага разьвіцьця.

Калі было зусім зразумела бачыць, як цёмны вандроўнік-дзікун, які ня ўмеў яшчэ навукова растлумачыць сабе ўсе зьявішчы прыроды, што гэты дзікун прыносіў духам у ахвяру ягнё, думаючы такім чынам залагодзіць іх; калі можна зразумець, што зусім мала-культурны першабытны земляроб, ня ведаючы ні разумнай апрацоўкі зямлі, ні угнаеньняў, ні трактараў, прыносіў у ахвяру богу-сонцу свой першы сноп зьнятага жыта маючы надзею такім чынам задобрыць яго—дык як-жа дзіка бачыць людзей дваццатага веку, людзей, перажыўшых найвялікшую з рэвалюцый, людзей, будуючых сацыялізм у рэспубліцы працы, якія яшчэ зараз пакорліва ідуць у касьцёлы, у цэрквы і сінагогі і яшчэ да гэтага часу веруюць у розныя цуды і забабоны.

* * *

Асеньнія яўрэйскія рэлігійныя сьвяты, таксама і сьвяты вясеньнія, носяць на сабе адбітак далёкай старасьветчыны.

Яны таксама ў свой час, як і сьвяты вясеньнія (вялікдзень і інш.), мелі свае тлумачэньне ў эканоміцы даўно адышоўшай у вечнасьць эпохі.

І яны таксама зараз, як і ўсе іншыя рэлігійныя сьвяты ўсіх рэлігійных культаў, зьяўляюцца перажыткам старасьветчыны—перажыткам, які ў сваіх антысавецкіх контр-рэвалюцыйных мэтах шырока скарыстоўваецца рабінамі, папамі, ксяндзамі і сэктантамі.

Вось, напрыклад, трэдзе па часу яўрэйскае сьвята суккот. У далёкія ад нас часы старасьветчыны гэта было вельмі вясёлае асеньняе сьвята збору вінаграду. Уласьнікі вінаграднікаў пераходзілі на час збору вінаграду ў шатры і тут, пасьля сканчэньня збору, наладжвалі вельмі вясёлыя п'янкі са скокамі і нічым ня прыкрытым цынізмам і распустай.

Пазьней рабіны пастараліся забраць у свае рукі і гэта, раней зьвязанае з эканамічнымі ўмовамі быту і само па сабе ў дастатковай меры распуснае сьвята.

Яны надалі яму зусім іншы чыста царкоўны сэнс, надалі яму шэраг нічога супольнага ня маючых з іх цэрамоній.

І вось з самага звычайнага хоць і ў дастатковай меры распуснага земляробчага сьвята, «служыцелі іеговы на зямлі» стварылі сабе зброю закабальваньня працоўных мас для лепшай экспляатацыі іх у інтарэсах капіталістаў і абшарнікаў.

* * *

Ужо даўно самым галоўным сьвятам сінагогальнага культу стаў так званы „судны дзень", ці па яўрэйску «іёмкіпурым», разам з папярэднімі да яго днямі «ачышчэньня ад грахоў» і новым годам.

Гэтыя рэлігійныя сьвяты (5 кастрычніка—«новы год» і 14 кастрычніка—„судны дзень") дзякуючы настойлівай і актыўнай прапагандзе рабінаў, зрабіліся ў вачох веруючага яўрэя настолькі сьвяшчэннымі, што ў гэтыя дні ў сінагогах можна ўбачыць ня толькі веруючых яўрэяў, але нават і такіх, якія ў звычайныя дні зусім не наведваюць або вельмі рэдка наведваюць малебствы.

Такое высокае значэньне ў вачох веруючых „суднага дню" і «новага году» тлумачыцца тым, што гэтыя сьвяты поўны ўсялякіх забабонаў і пры гэтым такіх забабонаў, якія зьвязваюцца рабінам з усім будучым жыцьцём веруючага яўрэя.

З новым годам зьвязана перакананьне, што як прызначыць „Іегова" ў гэты дзень, такім і будзе жыцьцё веруючага яўрэя ў працягу ўсяго надыходзячага году.

Таму,—запэўняюць рабіны сваіх веруючых,—трэба ў гэты дзень асабліва рупліва маліцца, асабліва дакладна выконваць усе рэлігійныя пастановы, асабліва часта наведваць сінагогу. Тады ўвесь твой год пройдзе шчасьліва, тады «Іегова» дапаможа табе ва ўсіх тваіх справах і пачынаньнях.

А пастаноў, якія з асабліва суровую дакладнасьцю павінны выконваць у дні „новага году" і „суднага дню" ўсе веруючыя яўрэі, хоць адбаўляй! Імі рабіны так аблыталі ўсё жыцьцё сваіх духоўных нявольнікаў, што літаральна няма такой хвіліны ў жыцьці гэтага веруючага яўрэя, у працягу якой ён мог-бы заставацца самім сабой, у працягу якой ён мог-бы больш спакойна, чымся ў сінагозе, прааналізаваць свае адносіны да ўсіх гэтых рабінаўскіх выдумак.

Гэтым рабіны дасягаюць сваёй асноўнай мэты. Забабонамі і шматлікімі працэдурамі яны стараюцца абкружыць, адмежаваць непраходнай сьцяной сваіх духоўных нявольнікаў ад здаровага ўплыву на іх бязбожнай савецкай грамадзкасьці.

Па вучэньню рабінаў, у «новы год» усе жыхары сьвету праходзяць перад богам, які судзіць у гэты дзень усіх людзей, які чытае ў іх сэрцах як у адкрытай кніжцы, які дае кожнаму па яго заслугах.

Але канчатковы свой прысуд бог выносіць толькі праз дзесяць дзён у так званы «судны дзень», у іём-кіпурым.

Разьлік рабінаў тут просты і зразумелы. У працягу дзесяці дзён бязупыннымі малітвамі і сядзеньнем у сінагогах, пастом і рознымі царкоўнымі цэрамоніямі так задурыць галаву веруючых, так запалохаць іх, так заблытаць іх забабонамі, каб гэтай рэлігійнай зарадкі ім хапіла на цэлы год, каб яны ў працягу ўсяго наступнага году былі паслухмянымі нявольнікамі і бязвольнымі стварэньнямі ў руках вопытных у сваёй справе рабінаў-ашуканцаў.

А наколькі бяссэнсоўны ўсе гэтыя забабоны, можна судзіць з двух пададзеных ніжэй прыкладах.

Напрыклад, самае распаўсюджанае з забабонаў паданьне расейскіх і беларускіх яўрэяў заключаецца ў тым, што бог дазваляе д'яблу ўхапіць у дні «ачышчэньня ад грахоў» і выцягнуць з сінагогі самага грэшнага яўрэя.

Дзякуючы гэтым забабонам, вакол „суднага дню" ствараецца дымавая заслона таямнічасьці і жудасьці, пры дапамозе якой рабіну зручней адурманьваць сваю „паству".

А вось яшчэ прыклад ужо проста барбарскага звычаю.

Веруючыя яўрэі не абмяжоўваюцца маленьнямі толькі ў сінагогах. І вось у сябе ў хаце глава сям'і бярэ за галаву пеўня або курыцу, тры разы памахае ёю ў паветры, гаворачы пры гэтым адпаведныя заклёны.

Ён заклікае на галаву ні ў чым нявіннай птушыны ўсе грахі сваёй сям'і, пасьля чаго заколе яе.

Пры гэтым забіваецца столькі пеўняў, колькі ёсьць мужчын у сям'і, і столькі кур, колькі ёсьць жанчын.

Надзвычайна „мілы" для дваццатага веку звычай! Ну чым адрозьніваюцца людзі, выконваючыя яго ад тых дзікуноў, якія ў эпоху далёкай старасьветчыны прыносілі сваім багам крывавыя ахвяры, якія ў сваіх храм

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР

Пастанова

Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

пра дапаўненьне пастановы ЦВК і СНК БССР за 22 чэрвена 1929 г. артыкулам 93³ Крымінальнага Кодэксу БССР

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць дапоўніць арт. 93¹ Крымінальнага Кодэксу арт. 93³ у наступнай рэдакцыі:

„Арт. 93³. Злосны неплацеж грамадзянамі, залічанымі ў тылавое апалчэньне, спэцыяльнага вайсковага падатку выклікае пазбаўленьне волі бяз строгай ізаляцыі да трох гадоў".

Вык. аб. Старшыні Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.
Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.
За сэкратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР У. Ігнатоўскі.
28 верасьня 1929 г.
г. Менск.

Постановление

Центрального Исполнительного Комитета и Совета Нар. Комиссаров БССР

о дополнении постановления ЦИК и СНК БССР за 22 июня 1929 года статьей 93³ уголовного кодекса БССР

Центральный Исполнительный Комитет и Совет Народных Комиссаров БССР постановляют дополнить ст. 93¹ Уголовного Кодекса ст. 93³ в следующей редакции:

„Ст. 93³. Злостный неплатеж гражданами, зачисленными в тыловое ополчение, специального военного налога вызывает— лишение свободы без строгой изоляции до трех лет".

Исп. об. Председателя Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Хацкевич.
Председатель Совета Народных Комиссаров БССР Н. Голодед.
За секретаря Центрального Исполнительного Комитета БССР В. Игнатовский.
28 сентября 1929 г.
г. Минск.

Пастанова

Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

пра зьмену арт. 1 палажэньня аб вэксалёх

На падставе п. 4 пастановы ЦВК і СНК Саюзу ССР за 14 жніўня 1929 г. „Пра аплату вэксалёў гэрбавым зборам" (Известия ЦИК СССР № 192—29 г.), Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць зьмяніць арт. 1 „Палажэньня аб вэксалёх" (З.З. БССР 1922 г., № 14, арт. 180), запісаўшы яго ў наступнай рэдакцыі:

„Арт. 1. Вэксалем называецца грашовая абавязанасьць, якая выдаецца адной старанай (вэксалядаўцам) другой старане (вэксалятрымаўцу) з закаваньнем выманьняў гэтага палажэньня.

Вэксалі бываюць простыя і пераводныя".

В. аб. Старшыні Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.
Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.
За Сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР У. Ігнатоўскі.
28 верасьня 1929 г.
г. Менск.

Постановление

Центрального Исполнительного Комитета и Совета Нар. Комиссаров БССР

об изменении от. 1 положения о векселях.

На основании п. 4 постановления ЦИК и СНК Союза ССР от 14 августа 1929 г. „об оплате векселей гербовым сбором" (Известия ЦИК СССР № 192—29 г.) Центральный Исполнительный Комитет и Совет Народных Комиссаров БССР постановляют изменить ст. 1 „Положения о векселях" (С.З. БССР 1922 г. № 14, ст. 180), изложив ее в следующей редакции:

„Ст. 1. Векселем называется денежное обязательство, выданное одной стороной (векселедателем) другой стороне (векселедержателю) с соблюдением требований настоящего положения.

Векселя бывают простые и переводные.

Исп. об. Председателя Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Хацкевич.
Председатель Совета Народных Комиссаров БССР Н. Голодед.
За Секретаря Центрального Исполнительного Комитета БССР В. Игнатовский.
28 сентября 1929 г.
г. Минск.

Пастанова

Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

пра зьмену абзаца 6-га арт. 70¹ палажэньня пра мясцовыя фінансы БССР.

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць запісаць абзац 6 арт. 70¹ Палажэньня пра мясцовыя фінансы БССР (З.З. БССР 1929 г., № 14, арт. 70) у наступнай рэдакцыі:

„З апэратыўных адзінак прадпрыемтваў, якія абкладаюцца дзяржаўным прамысловым падаткам у цэнтралізаваным парадку, прадугледжаны гэтым артыкулам падатак спаганяецца ў процантных адносінах да акладаў прамысловага падатку, якія для гэтае мэты вылічаюцца са звароту кожнай паасобнай апэратыўнай адзінкі па правілах, што прадугледжаны ў палажэньні аб памянёным падатку.

Ажыцьцявіць гэтую пастанову з 1-га кастрычніка 1929 г.".

В. аб. Старшыні Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.
Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.
За Сакратара Цэтральнага Выканаўчага Камітэту БССР У. Ігнатоўскі.
28 верасьня, 1929 г.
г. Менск.

Постановление

Центрального Исполнительного Комитета и Совета Нар. Комиссаров БССР

об изменении абзаца 6, от. 70¹ положения о местных финансах БССР.

Центральный Исполнительный Комитет и Совет Народных Комиссаров БССР постановляют изменить абзац 6 ст. 70¹ Положения о местных финансах БССР (С.З. БССР 1929 г. № 14, ст. 70) в следующей редакции:

„С оперативных единиц предприятий, облагаемых государственным промысловым налогом в централизованном порядке, предусмотренный этой статьей налог взимается в процентном отношении к окладам промыслового налога которые для этой цели исчисляются с оборота каждой отдельной оперативной единицы по правилам, предусмотренным в Положении об упомянутом налоге.

Настоящее постановление ввести в действие с 1-го октября 1929 года.

Исп. об. Председателя Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Хацкевич.
Председатель Совета Народных Комиссаров БССР Н. Голодед.
За Секретаря Центрального Исполнительного Комитета БССР В. Игнатовский.
28 сентября 1929 г.
г. Минск.

Пастанова

Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

пра зьмену арт. 26 Грамадзянскага Працэсуальнага Кодэксу.

На падставе пастановы ЦВК і СНК СССР за 7 жніўня 1929 г. „Аб падсудносьці іскаў супроць адказчыкаў, якія ня маюць месца пражываньня ў Саюзе ССР" (З. З. СССР 1929 г., № 51, арт. 465), Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць зьмяніць арт. 26 Грамадзянскага Працэсуальнага Кодэксу БССР зьмяніць, запісаўшы яго ў наступнай рэдакцыі:

„Арт. 26. Іскі да адказчыка, які знаходзіцца за граніцай альбо месца пражываньня якога не вядома, падаюцца па месцы знаходжаньня маемасьці, альбо па апошнім вядомым месцы сталага пражываньня альбо заняткаў у межах БССР; апошняе месца пражываньня альбо занятак адказчыка павінна быць, ува усякім рэзе, пэўна устаноўлена".

В. аб. Старшыні Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.
Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.
За сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР У. Ігнатоўскі.
28 верасьня 1929 г.
г. Менск.

Постановление

Центрального Исполнительного Комитета и Совета Нар. Комиссаров БССР

об изменении от. 26 Гражданского Процессуального Кодекса.

На основании постановления ЦИК и СНК Союза ССР от 7 августа 1929 г. „О подсудности исков к ответчикам, не имеющим местожительства в Союзе ССР" (С. З. СССР 1929 г. № 51, ст. 465), Центральный Исполнительный Комитет и Совет Народных Комиссаров БССР постановляют ст. 26 Гражданского Процессуального Кодекса БССР изменить, изложив ее в следующей редакции:

„Ст. 26. Иски к ответчику, который находится за границей или местожительство коего неизвестно, пред'являются по месту нахождения имущества или по последнему известному месту постоянного жительства или занятия в пределах БССР; последнее известное местожительство или занятие ответчика должно быть, во всяком случае, достоверно установлено".

Исп. об Председателя Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Хацкевич.
Председатель Совета Народных Комиссаров БССР Н. Голодед.
За секретаря Центрального Исполнительного Комитета БССР В. Игнатовский.
28 сентября 1929 г.
г. Минск.

Вынікі кантрактацыі на Аршаншчыне.

Кантрактацыя пасеваў га Аршаншчыне ў 1928-29 г., у параўнаньні з 1927-28 мае значнае павялічэньне як па колькасьці культур (у 1927-28 г.—3 культуры, а ў 1928-29 г.—9 культур), так і па закантрактаванай плошчы (1927-28 г. усяго было закантрактавана 5147 гэктараў а ў 1928-1929 г.—9614 га).

Кантрактацыю правялі амаль што ва ўсіх калектыўных гаспадарках, насеннаводных таварыствах, пераважна групавым мэтадам, пры захаваньні клясавай лініі: у кантрактацыю ўцягваліся бядняцка-сераднцкія гаспадаркі вёскі, якія забясьпечваліся вытворча-гаспадарчымі прыладамі, грашовымі авансамі і натуральнымі пазыкамі.

Агульны ўдзел калгасаў у кантрактацыі азімых культур—13 проц., іншых вытворчых аб'яднаньняў—2 пр. групы—53 проц. і індывідуальныя гаспадаркі—32 проц.

Такім чынам, сацыяльны склад закантрактаваных у параўнаньні з мінулым годам па Аршаншчыне значна палепшыўся.

У часе правядзеньня кантрактацыі каапэравана за кошт фанду каапэраваньня беднаты і ўласных сродкаў кантрактоўшчыкаў 648 гаспадарак: калгасаў—8, бядняцкіх гаспадарак—390, сераднцкіх — 246 і заможных—4.

Дзеля пасьпяховага правядзеньня кантрактацыі і стварэньня (закон гэтага пытаньня больш шырокай грамадзкай думкі—акрсельсаюз у 5 раёнах акругі праведзены кароткатэрміновыя сельска-гаспадарчыя курсы па ільнаводству, якімі было ахоплена 300 чал., у 6 раёнах закладзена 40 ільнаводных паказальных вучасткаў і ў 3 раёнах—10 паказальных вучасткаў па разьвядзеньні канапель.

У часе правядзеньня асеньняй пасеўнай кампаніі сельска-гаспадарчая каапэрацыя выканала заданьне па кантрактацыі азімых на 107,6 проц.

Трэба адзначыць, што кантрактацыя яшчэ не заняла належнага месца ў шэрагу мерапрыёмстваў па рэканструкцыі сельскае гаспадаркі і не калектывізацыі. Прычым, у правядзеньні кантрактацыі ёсьць і шэраг недахопаў, а іменна:

Амаль адсутнічае праверка выкананьня кантрактоўшчыкамі абавязкаў аб палепшаньні вядзеньня гаспадаркі і недастатковае абслугоўваньне іх з боку аграномічнага пэрсаналу, з прычыны чаго да апошняга часу кантрактацыя амаль што зусім не дапамагала калектывізацыі сельскай гаспадаркі і ўнядрэньню агрыкультурных мерапрыёмстваў.

Ня былі ўлічаны ў поўнай меры асаблівасьці райёнаў пры вызначэньні заданьня на кантрактацыі для паасобных сельсаветаў і вёсак, што прывяло да невыкананьня паасобнымі таварыствамі заданьняў і памяншэньня заданьняў для другіх таварыстваў і раёнаў.

Несваечасова атрымліваліся ад цэнтральных устаноў грашовыя авансы, дагаворы, часта зьменьваліся заданьні (заданьне па бульбе мянялася 4 разы). Адсутнічала па некаторых раёнах (Дрыбін, Расна і Ворша) растлумачальная работа ў часе падрыхтоўкі да кантрактацыі.

Несваечасова і недастаткова завозіўся насенны матар'ял у акругу, асабліва ячмень, канюшына і штучныя ўгнаеньні. Усё гэта ўтворала няспрыяючыя ўмовы для выхаваньня плянавага заданьня па кантрактацыі; недастатковая колькасьць гатунковага насеньня (ячмень, бульба) таксама мела дрэнны ўплыў на правядзеньне кантрактацыі.

Выходзячы з таго, што кантрактацыя павінна дапамагаць рэканструкцыі і калектывізацыі сельскае гаспадаркі і палепшыць справу арганізацыі плянавага абмену прадуктаў паміж горадам і вёскай, акрсельсаюз, райвыканкомы і саветы Аршаншчыны павінны будуць прасачыць за выкананьнем дырэктыў па збору закантрактаванай прадукцыі с.-г. крэдытнымі таварыствамі, своечасова рэагаваць на адмоўныя факты, дабіцца 100 проц. выкананьня збору закантрактаванай прадукцыі ў вызначаныя тэрміны.

Адначасова трэба ліквідаваць запазычанасьць па кантрактацыі мінулага году.

Трэба зацаваць групавы мэтад кантрактацыі, які ў умовах акругі знашоў сваё праламленьне, вядома, забясьпечкўшы правядзеньне выразнаклясавай лініі, вядучы жорсткую барацьбу як са скрыўленьнем клясавай лініі, так і з супраціўленьнем кулацтва.

С. Лодысоў.

Узмацнім наступ на клясавага ворага.

Ня трэба верыць кулацка-нэпманскім плёткам.

У апошні час кулацка-нэпманскія элементы распаўсюджваюць чуткі, што быццам в 15 кастрычніка ліквідуюцца ўсе рынкі, а таксама прыватны гандаль.

Інспэктар Менскага Акргандлю тав. Гравіт у сувязі з гэтым паведаміў нашаму супрацоўніку наступнае:

Гэтыя хлусьлівыя чуткі ня маюць пад сабой ніякага грунту. Яны зьяўляюцца плёткамі клясава варожых нам асоб.

Рашучае наступленьне кулакоў і нэпманаў выклікае актыўнасьць бядняцка-сераднцкай часткі сялянства, аб чым сьведчыць пасьпяховасьць хлебазагатовак па Менскай акрузе. Мы маем раёны, дзе пляны загатовак выкананы ўжо на 75 проц., аднак, у некаторых раёнах праца разгорнута недастаткова.

Нашы мэтады хлебазагатовак накіраваны да таго, каб узьняўшы актыўнасьць бядняцка-сераднцкіх пластоў вёскі, прымусіць кулацкія элементы здаваць хлеб ня прыватніку, а дзяржаве. Гэты рашучы наступ выклікаў выступленьне кулакоў і нэпманаў і рэзкага антысавецкага элемэнту і які імкнецца падарваць эканамічную моц нашай краіны. Трэба прыняць рашучыя захады супроць тых, хто роспаўсюджвае антысавецкія настроі сярод працоўных.

Забясьпечаньне Менску прадуктамі харчаваньня і прамысловасьці.

Ніякіх перабояў у забясьпечаньні гораду прадуктамі ня будзе.

У Доме Чырвонай арміі 3-га кастрычніка адбыўся сход упаўнаважаных МЦРК, на якім былі заслуханы даклады аб зваротах МЦРК і пэрспэктывах забясьпечаньні пайшчыкаў прадметамі харчаваньня і прамысловасьці.

Сыстэма ўвядзеньня наборных кніжак на хлеб дала магчымасьці бесперабойна забясьпечыць пайшчыка хлебам. Уся выпечка хлеба скапцэтравана ў 2-х мясцох: хлебазаводзе і буйнай хлебапякарні.

Пэрспэктывы забясьпечаньня хлебам на наступны год зусім здавальняючыя.

Становішча з крупамі на наступны год будзе яшчэ лепшае, чымся ў мінулым годзе, дзякуючы большаму ўраджаю.

МЦРК атрымаў летась 94 вагоны круп. Але асартымэнты іх ня зусім здавальняючыя: не хапае бабовых—фасолі, гароху, няма ў поўнай меры і рысу.

З мясам улетку былі перабоі. Зараз прыдзецца ўвесьці нарміраваньне продажу мяса па наборных кніжках. Дзеля палепшаньня продажу мяса пашырана сетка крам; апроч таго, у мясных крамах уведзен продаж мяса ў 2 зьмены.

У 1928-29 г. у сярэднім у дзень прадавалася па 500 пуд. мяса, на наступны год мяркуецца давесьці продаж мяса да 800 п. у дзень.

З сьвіным салам справа абстаіць ня зусім добра, бо МЦРК мае мала запасаў яго, але трэба спадзявацца, што праз месяц на рынку зьявіцца ўжо новае сала. Таксама вялікія запатрабаваньні ёсьць на сьметанковае масла.

Крамы МЦРК змогуць адпускаць да вясны ня больш, як па 1200 пуд. у месяц. Значна лепш абстаіць справа з алеем, якога сёлета будзе больш, чым летась.

У галіне забясьпечаньня гораду тлушчамі справа палепшыцца дзякуючы арганізацыі маргарынавага заводу, які пачаў выпускаць сваю прадукцыю.

Вялікі недахоп адчуваецца ў малаку. Горад патрабуе ў дзень 30.000 літр. малака, а праз крамы МЦРК праходзіць толькі 10.000 літраў. У сувязі з гэтым выдаюцца абанэмэнты на малако тым пайшчыкам, якія маюць малых дзяцей.

Праўленьне МЦРК вядзе значную работу па загатоўцы розных прадуктаў гародніны. Будзе загатоўлена да 400000 п. бульбы, будзе заквашана да 18.000 пуд. капусты і інш.

Цукер будзе адпускацца па-ранейшаму.

Завоз сьвежай рыбы і селядцоў палепшаецца. Ужо завезена 4 вагоны селядцоў. У хуткім часе будзе атрымана 5000 пуд. беларускага карпа і значныя партыі завознай сьвежай і салёнай рыбы.

Забясьпечаньне мануфактурай паляпшацца толькі пачынаючы з другога кварталу, калі скончацца хлебазагатоўкі, у раёнах якіх зараз накіроўваецца ўся маса мануфактуры.

* * *

У спрэчках па дакладах праўленьня МЦРК выступіў прадстаўнік Цэнтрасаюзу т. Волкаў. Прамоўца спыніўся на тым, што пайшчыкі павінны дабівацца таго, каб тавар у крамах ЦРК прадаваўся добраякасны. У гэтай галіне ня можа быць ніякага патурання: за дрэнную якасьць тавару павінна несьці адказнасьць адміністрацыя тых прадпрыемстваў, якія яго выпускаюць.

Некаторыя ўпаўнаважаныя скардзіліся на тое, што бульба ў складах ЦРК часта бывае гніляя, у той час, калі на вольным рынку можна дастаць добрую бульбу па тэй-жа цане.

— МЦРК спыніў продаж падашны,— даводзілі некаторыя прамоўцы,—і амаль нічога ня зроблена, каб наладзіць папраўку абутку.

ХРОНІКА.

Пленум Менскага гарсавету.

3-га кастрычніка на чарговым пленуме Менгарсавету быў заслуханы даклад т. Алейнікава аб забесьпячэньні гораду электрычнасьцю і вадой.

— У сучасны момант магутнасьць станцыі складае каля 3000 кілёват. Праз месяц магутнасьць яе ўзрасьце да 3560 кілёват. Дзеля больш рацыянальнага выкарыстоўваньня электра-энэргіі некаторыя прадпрыемствы пярэйдуць на працу з 7 гадзін раніцы, што дасьць эканомію ў 350 кілёват.

У хуткім часе на заводах „Дрэваапрацоўшчык" і „Бальшавік" будуць устаноўлены новыя генэратары; заказан за межамі генэратар сыстэмы „Мэтро-Віпэрс" на 3750 кілёват. У наступным годзе магутнасьць менскай станцыі значна ўзрасьце.

Распрацоўваецца праэкт пабудовы новай электрастанцыі. Ёсьць думка аб пабудове станцыі на Судобскіх балотах пры станцыі Жодзіна, дзе вучастак Студзенкі мае тарфяны масыў у 49.700 куб. мэтраў. Пры пабудове станцыі на гэтай тэрыторыі яна зможа забясьпечыць энэргіяй і г. Барысаў. Аднак, трэба думаць, што станцыя будзе пабудавана на Серабрянцы ў Менску.

Гаворачы аб працах „Вадаканалу", дакладчык адзначыў:

— У будучым годзе капітальнае будаўніцтва „Вадаканалу" будзе павялічана ў тры разы. Атрыманы тры новыя машыны. У наступным годзе мы зможам даць 20-21 тысячу вёдзер вады ў гадзіну.

НА БЕСПЕРАПЫННЫ ТЫДЗЕНЬ.

СУДОВЫ АПАРАТ—НА БЕСПЕРАПЫННЫ РАБОЧЫ ТЫДЗЕНЬ.

Апарат нарсуду 2 вучастку пераведзен на бесперапынны рабочы тыдзень з 1 кастрычніка.

На бесперапынны рабочы тыдзень таксама пераводзяцца іншыя судовыя апараты.

НАРКАМЗЕМ ПЕРАХОДЗІЦЬ З 7 КАСТРЫЧНІКА.

Пачынаючы з 7 кастрычніка, апарат Наркамзему пераходзіць на бесперапыўны тыдзень і на 7-мігадзінны рабочы дзень. Усе пытаньні ўжо пагоджаны і абмяркоўваліся на сходзе супрацоўнікаў.

Рацыяналізатарокай групе даручана выпрацаваць распарадак працы і адпачынку розных груп зямельных працаўнікоў, якія працуюць у летні час у сельскіх мясцовасьцях.

Зроблен ужо расклад на кастрычнік, у якім вызначаны дні адпачынку для кожнага супрацоўніка.

У БЕЛСЕЛЬТРЭСЬЦЕ ПАЧАЛІ ПРАЦАВАЦЬ ПА НОВАМУ.

Белсельтрэст перайшоў на бесперапынны тыдзень з 1 кастрычніка.

Расклад адпачынку ўжо зроблен да студзеня 1930 г.

З 15 КАСТРЫЧНІКА ПЕРАХОДЗЯЦЬ САВГАСЫ.

Зараз у Белсельтрэсьце распрацоўваецца парадак пераходу на бесперапынны тыдзень усіх савгасаў Белсельтрэсту. Пераход на бесперапынны тыдзень у савгасах мяркуецца распачаць не пазьней 15 кастрычніка.

2123000 руб. на пашырэньне і ўзмацненьне працколектываў.

Паводле пляну, у мінулым гаспадарчым годзе мелася на ўвазе ўцягнуць у працколектывы БССР 3640 беспрацоўных і выдаткаваць на гэту патрэбу 1015 тысяч рублёў.

За 11 месяцаў 1928-29 г. у працколектывы было ўцягнута 3285 чалавек—выканана 90,3 проц. пляну. Да 1 кастрычніка плян выканан прыблізна на 95-96 проц. Недавыкананьне пляну тлуматыцца тым, што шэраг прадпрыемстваў працколектываў у працягу году былі перададзены мясцовай і дзяржаўнай прамысловасьці. Між тым у гэтых прадпрыемствы мелася на ўвазе прынядь поўную колькасьць беспрацоўных.

У бягучым гаспадарчым годзе ў іюнуючыя працколектывы мяркуецца ўцягнуць да 2000 беспрацоўных. Прычым будзе перададзена 12 прадпрыемстваў працколектываў з 2653 рабочымі мясцовай прамысловасьці, 36 прадпрыемстваў з 1097 рабочымі сакратуннай прамысловасьці і 9 прадпрыемстваў з 1318 рабочымі—дзяржаўнай прамысловасьці.

Мяркуецца значна пашырыць выпрацоўку мэтрычных мер, рыбалоўных прыладаў, чарапіцы, калёс. Пашыраецца керамічная вытворчасьць у Менску і выраб ватты ў Віцебску і шэраг іншых прадпрыемстваў працколектываў.

На ўсе мерапрыемствы па пашырэньню прадпрыемстваў працколектываў мяркуецца выдаткаваць за год 2123000 руб.

Экскурсія ў калгас „Камсамолец".

Сёньня 25 чал. рабочай моладзі з менскіх фабрык і заводаў выяжджаюць у калгас „Камсамолец", дзе яны ў працягу некалькіх дзён будуць знаёміцца са станам работы і прымуць удзел у правядзеньні антырэлігійнай кампаніі ў сувязі з яўрэйскімі сьвятамі.

Чатыры працколектывы пераведзены на мясцовы бюджэт.

Прэзыдыум Менгарсавету пастанавіў перавесьці на мясцовы бюджэт 4 менскія працколектывы: рымароў, шчотачнікаў, тэкстыльшчыкаў і войлачнікаў.

На гэтых прадпрыемствах працуе каля 1300 рабочых.

260 выйгрышаў на здадзеныя на хаваньне аблігацыі.

На аблігацыі 2-й пазікі індустрыялізацыі, якія здадзены на хаваньне у галоўную касу ашчаднасьці, у апошнім тыражы выпала 260 выйгрышаў ад 20 руб. да 100 руб. і вышэй.

Галоўная каса ашчаднасьці ўжо паведаміла ўсіх трымальнікаў пазыкі, на аблігацыі якіх выпалі выйгрышы. Выплата выйгрышаў распачнецца з панядзелка 7 кастрычніка.

Перад пускам трамваю.

Прэзыдыум Менскага гарадзкога савету зацьвердзіў пастановы адпаведных інстанцый аб працы трамваю.

Пленум гарсавету пастанавіў узесьці адзіны тарыф за праезд—у 10 кап.

Вагоны чакаюцца ў Менску 6-7 кастрычніка. Падрыхтаван штат вагона-кіраўнікоў.

Дапамога рабочым клюбам у правядзеньні антырэлігійнай кампаніі.

Яўрэйскі дзяржаўны тэатр распрацаваў шэраг мерапрыемстваў па дапамозе рабочым клюбам у правядзеньні антырэлігійнай кампаніі. Арганізавана спэцыяльная кансультацыя па дапамозе мастацкім выступленьням у часе сьвят. У дні сьвята тэатр дасьць шэраг пастановак для членаў саюзаў.

Пабудова будынку для курсаў шофэраў.

Каля пляцу трамвайнага парку ў бліжэйшыя дні пачнецца пабудова памяшканьня для арганізацыі ў ім курсаў па падрыхтоўцы шофэраў. Будынак будзе гатоў праз 1 з палов. месяцы.

Заняткі на курсах мяркуецца распачаць з другой паловы лістапада. Курсы будуць укамплектаваны беспрацоўнымі з Біржы Працы, усяго будзе прынята 50 чалавек. Праграма курсаў разьлічана на 6 месяцаў.

Фізкультура і спорт.

Вэлё-прабег Менск—Астрашыцкі-Гарадок.

У нядзелю, 13 кастрычніка, адбудзецца вэлёпрабег на маршруту Менск—Астрашыцкі-Гарадок. Старт і фініш рог вуліц Энгельса і К. Маркса.

У прабегу прымуць удзел 30 чалавек. Лепшым фізкультурнікам будуць выданы прэміі.

Агульна-гарадзкія спаборніцтвы па футболу.

З 6 кастрычніка пачынаюцца на летнім спартыўнай пляцоўцы „Прафінтэрн" агульна-гарадзкія спаборніцтвы па футболу.

Удзельнічаюць 10 лепшых команд Менску. Пераможцам будуць выданы дыпломы.

Поўны развал рыбаводнай гаспадаркі ў Полаччыне.

Янўйская рыбная гаспадарка падзелена між кулакамі

У час, калі пашырэньню рыбаводства надаецца вельмі вялікае значэньне, калі на справу арганізацыі штучных рыбных гаспадарак асыгнуюцца вялікія грошы,—мы маем такія факты, што сумысьля нішчаць рыбныя гасп., што будынкі рыбаводнага савгасу прадаюцца за бясцэнак, а на лепшай зямлі арганізуюцца хутары.

З такімі фактамі можна спаткацца ў Полацкай акрузе. З прычыны нядбайных адносін Полацкага акрэа да рыбаводнай справы на 25 проц. разбурылася ўся рыбная гаспадарка, якая займае даволі паважнае месца ў гаспадарцы акругі. Уся работа па рыбнай гаспадарцы вялася бяз жаднае сыстэмы, бяз жаднай зацікаўленасьці.

Інспэктар рыбаводства Рудамінаў адчуваў сябе літаральна, як „рыба ў вадзе", нічога не рабіў, а пэнсію атрымліваў з 2 месц—з акрсельсаюзу і акрэамаддзелу. За 2 гады сваёй дзейнасьці Рудамінаў ня мог знайсьці часу, каб вывучыць вазёрныя вадаёмы акругі, ні разу не прадставіў справаздачы аб сваёй працы.

Полацкі акрэа таксама нічога не рабіў у галіне пашырэньня рыбаводнай справы, у той час, як у акрузе можна арганізаваць самыя буйныя штучныя рыбаводныя гаспадаркі. У савгасе Варонічы была раней рыбаводная гаспадарка, якая давала штогод да 2800 чыстага прыбытку, аднак, арксамаддзел скасаваў гэту гаспадарку: яе падзялілі паміж кулакамі. На самай лепшай зямлі арганізавалі моцныя хутары па 15—20 гэкт. кожны, будынкі савгасу прадалі за бясцэнак заможным сялянам; гаспадарку пакінулі бяз зямлі, бяз лесу.

Рыбавод Савін, які давёў гаспадарку да пагібелі, карыстаецца поўным падтрыманьнем з боку згадачыка акрэа Вілюгі. Савіну выпісалі незаконна падёмныя, калі ён быў зьняты з пасады, а праз некаторы час яго ізноў адзавілі і заплацілі за „вымушаны" прагул. Савін так разбурыў справу, што зараз туды баяцца ехаць на працу інш. спэцыялісты.

СПРАВАЧНЫ АДДЗЕЛ.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК НА 5-е КАСТРЫЧНІКА 1929 г.

	Куп.	Прад.
1 6 проц. выйгр. паз.	4.95	—
Бясправ. выйгр. паз. 26 г.	127.25	129.25
Выйгр. пазыка 1929 г.	100.15	100.55
10 проц. выйгр. паз. 27 г.	25.44	25.54
3-я сялянск. выйгр. паз. 27 г.	5.	—
Дзярж. паз. узм. сял. гас.	10.40	10.75
1 выйг. паз. індустр. 27 г.	25.16	25.26
2 „ „ „ проц.	25.26	25.36
2 „ „ „ 6-проц.	25.26	25.36
11 проц. дзярж. паз. 28 г.	101.03	101.08
12 проц. рэнтная паз. 27 г.	104.12	—

Апавяшчэньне

— АК КП(б)Б, ЦСПСБ і акрсавет шэфтаварыства на суботу 5 кастрычніка, а 6 гадз. увечары ў вялікай залі клюбу Карла Маркса сьлікне нараду апоргаў ячэек КП(б)Б, старшынь рабчыомаў, старшынь выканбюро і рабочыя брыгады. На нарадзе т. Тамашэўскім будзе зроблен інструктыўны даклад аб правядзеньні „Дню ўраджаю і калектывізацыі".

МЕНАКРУГКОМ КП(б)Б.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

ТЭАТР-КІНО

КІНО-ТЭАТР „КУЛЬТУРА".	З панядзелка 30 верасьня. „БЭНЭФІС КЛЁУНА ЖОРЖА" драма ў 6 частках. Звыш праграмы: кіно-хроніка «СОВКІНО». Пачатак а 7 гадзіне.
КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ».	З панядзелка 30-га верасьня. МАСТАЦКІ ФІЛЬМ „СІНІЯ КАЎНЯРЫ" у 5 частках. Звыш праграмы: камэдыя „ЛАСО" у 2-х част. Пачатак а 7 гадзіне
КІНО ПРАЛЕТАРЫ	З ПАНЯДЗЕЛКА, 30-га ВЕРАСЬНЯ. МАСТАЦКАЯ ДРАМА „ЧАЛАВЕК З ПАРТФЭЛЕМ" Пачатак а 7 з пал. гадзіне.
1-Ы ДЗІЦЯЧЫ КІНО-ТЭАТР „ЮНЫ ПІАНЭР".	2 фільмы вытворчасьці БДкіно. „ДЖЭНТЛЬМЭН І ПЕВЕНЬ" у 6 частках. „Бунт зубоў" у 2 частках. Пачатак а 3 гадзіне 30 хв. Каса а 2 гадз.

АБВЕСТКА.

Паведамляецца, што заняткі па гомельскім дзённым рабфаку пачнуцца 6 кастрычніка а 10 гадзіне раніцы. Усе залічаныя павінны зьявіцца 5 кастрычніка ў памяшканьне Рабфаку (парк імя Луначарскага).

Рабфак.

На падставе пастановы ЦВК і СНК СССР ад 4-га верасьня г. г. АБ АБАВЯЗКОВЫМ СТРАХАВАНЬНІ МАЁМАСЬЦІ АБАГУЛЕНАГА СЭКТАРУ НАРОДНАЕ ГАСПАДАРКІ, УСЯ МАЁМАСЬЦЬ (будынкі, рухомасьць, судны, тавары, жывёла і пасевы), НАЛЕЖАЧЫЯ ЎСІМ КААПЭРАЦЫЙНЫМ АРГАНІЗАЦЫЯМ (калгасам, с.-г. т-вам, сам.-прам. арцелям, жыльлёвым таварыствам, інвалідн., мэліарацыйным, тарпяным, машынным, агнятрывалым, малочным, птушкаводным, рыбацкім і інш.), ЛІЧУЦЦА ЗАСТРАХАВАНЫМІ з 1-га КАСТРЫЧНІКА г. г. У КААПСТРАХСАЮЗЕ і ў выпадку страты ад навальнага ліха, прадугледжанага правіламі страхаваньня, пацярпеўшыя страту каапэрацыйныя арганізацыі маюць права на зварот яе.

Паказаныя вышэй каапарганізацыі ПАВІННЫ з свайго боку зрабіць вучот належачай ім маёмасьці па формах Каапстрахсаюзу. Аб суме налічанай прэміі, парадку і тэрмінах узносу страхавых плацажоў — указаньні будуць даны Агенцтвамі Каапстрахсаюзу ў бліжэйшым часе.

БЕЛКААПСТРАХАГЕНЦТВА.

Узьдзенскі райвыканком Менскае акругі АБВЯШЧАЕ, што 13 кастрычніка 1929 г. роўна ў 10 гадзін раніцы ў м. УЗДА Узьдзенскага раёну АДБУДУЦЦА

ТАРГІ

на прадажу хаты, сараю, камоды належачыя гр-ну МАРШАКУ Іцку, і хаты, сараю, камоды, шкафу, самавару, весоў належачыя гр-ну ПІКУСУ Вульфу, за невыплату імі падаходнага налогу ўраўзбору. Усялякія справаўкі аб таргох можна атрымаць у аддзеле Камгаву РКК з 9 гадзін раніцы да 3-х гадзін дню акрамя панядзелка.

КАМІСІЯ.

Гэтым паведамляецца, што згодна пастановы ВСНГ БССР Беларускі Дзяржаўны Сярніковы Трэст, які знаходзіцца ў Гомелі, аб'яднаецца

З ЛЯСНЫМ ТРЭСТАМ БЕЛАРУСІ „ЛЕСБЕЛ",

які знаходзіцца ў Менску, з 1 кастрычніка 1929 г.

Месца знаходжаньня новага аб'яднанага трэсту будзе ў г. Менску.

З 27 верасьня г. г. просім усю клієнтуру па ўсіх пытаньнях, адносінах, справаўках і г. д. зьвяртацца ў „Лесбел" ў Менску.

Па разьліках за апэрацыі да 1-Х 1929 г. трэба зьвяртацца ў бухгальтэрыю быв. Бел. Сярніковага Трэсту: Гомель, рог Савецкай і Сялянскай вуліц.

Пры гэтым паведамляем, што ўсе рэкламацыі, грашовыя прэтэнзіі і інш. павінны быць прад'яўлены не пазьней 15 кастрычніка 1929 г., пасьля якога тэрміну ніякія прэтэнзіі прыняты ня будуць.

ЛІКВІДКОМ БЕЛ. СЯРНІКОВАГА ТРЭСТУ.

АБВЕСТКА.

Даводзіцца да ведама ўсіх, што ліквідацыйная камісія Цэнтраземскладу працу па

ЛІКВІДАЦЫІ ЦЭНТРАЗЕМСКЛАДУ СКОНЧЫЛА 20 ВЕРАСЬНЯ.

Пратэнзіі крэдыторaў і інш., якія да гэтага часу ня былі паведамлены, БОЛЬШ ПРЫМАЦЦА НЯ БУДУЦЬ. Ня скончаныя справы па ліквідацыі Цэнтраземскладу перададзены ў Наркамфін Беларусі, таму за ўсімі справаўкамі зварачвацца ў НКФ, толькі не ў парадку пратэнзіі.

Старшыня Ліквідкому СІДАРОВІЧ. Галоўны бухгальтар СРЭДЗІНСКІ.

Менскі Загс выклікае гр. ЛАШКЕВІЧА Фёдара Францава на 4 лістапада 1929 году па справе аб скасаваньні шлюбу з гр-кай ЛАШКЕВІЧ Надзеждай.

Барысаўскі райгарзагс выклікае гр. ДАНІЛАВУ Ганну Георгіеву на 2 лістапада г. г. па справе аб скасаваньні шлюбу, згодна заяв